КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 18 (194)
◂ 14 МАЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ДРУГОЕ ПРЫШЭСЦЕ**

Стар. 6

**ТАЛЕРАНТНЫЯ ПРАГМАТЫКІ**

Беларускае грамадства ў сваім геапалітычным выбары кіруецца прагматычнымі разлікамі — такія высновы сумеснай сацыялагічнай працы

Стар. 5

**ЛІДЭР НАЦЫІ АБО БІЧ БОЖЫ**

Пра казахскі аўтарытарызм журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з праваабаронцам з Алма-Аты Андрэем Грышыным

Стар. 12

**ПАДЗЕІ Ў РЫТМАХ І РЫФМАХ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ПРАФЕСІЯ — ПАЭТ**

Аналітыка ад Марыі Мартысевіч

▸ ГАДАВІНА

# TRIAL-ВЕРСІЯ «УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА»

Вольга ХВОІН

**Цягам года ад пачатку праграмы «Усходняе партнёрства» Беларусь праявіла сябе як актыўны яе ўдзельнік. Аднак зразумела, што для супрацоўніцтва не дастаткова толькі жаданняў афіцыйнага Мінска і апазіцыі. Беларуска-еўрапейскім адносінам усё яшчэ бракуе палітычнай волі да выканання грунтоўных патрабаванняў ЕС у сферы паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека, а таксама ўмення ісці на кампраміс.**



Так, у лютым на нявызначаны тэрмін было адменена пасяджэнне парламенцкай асамблеі праграмы «Усходняе партнёрства» (Еўранэст) з-за супярэчнасцяў па складзе беларускай дэлегацыі. Бакі не змаглі дамовіцца адносна таго, хто будзе прадстаўляць нашу краіну ў Еўранэсце: афіцыйны Мінск не пагадзіўся на прадстаўніцтва апазіцыі, а Брусель — на тое, каб беларуская дэлегацыя складалася выключна з дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Еўранэст як структура насамрэч не будзе мець вялікай палітычнай вагі, аднак у адносінах паміж Беларуссю і ЕС паказвае гатоўнасць нашай краіны да кампрамісу і дыялогу. Нагадаю, што АБСЕ мела прэтэнзіі да выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якія адбыліся ўвосень 2008-га.

Не так даўно з'явіўся новы маяк у моры непаразуменняў з ЕС. Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (хаця гэта і не мае наўпраставага дачынення да праграмы «Усходняе партнёрства», але ж завязана на агульнае збліжэнне з ЕС) прыняла рэзалюцыю, якая прадугледжвае прыпыненне кантактаў з Беларуссю на высокім узроўні. Генеральны сакратар СЕ Турб'ерн Ягланд заявіў, што Савет Еўропы не бачыць магчымасцяў для развіцця дыялогу з Беларуссю.

«Мы атрымалі паразу, калі ў Беларусі нядаўна былі прыведзеныя ў выкананне дзве смяротныя кары. Як вы ведаеце, ні адна краіна не можа быць сябрам Савета Еўропы, калі ў ёй адбываюцца смяротныя пакаранні», — падкрэсліў Ягланд. Палітык зазначыў, што аддае сабе справаздачу ў тым, што ў Беларусі няма дэмакратычнага працэсу, пры якім людзі маглі б памяняць дзеючы рэжым, «але Савет Еўропы не можа ўмешвацца ва ўнутраныя справы асобных краін, асабліва ў справы краін, якія не з'яўляюцца яе сябрамі».

Варта прыгадаць, што праграма «Усходняе партнёрства» з'яўляецца працягам Еўрапейскай палітыкі суседства, якая мае на мэце ўмацаванне адносін з краінамі — суседзямі ЕС і супрацоўніцтва па стварэнні зоны бяспекі і дабрабыту праз пакрокавую стратэгію. Пасля з польска-шведскай ініцыятывы ў дадатак да Еўрапейскай палітыкі суседства паўстала «Усходняе партнёрства» — праграма для шасці постсавецкіх краін — суседзяў ЕС (Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Украіны). У сакавіку 2009 года лідэры 27 краін ЕС прынялі рашэнне наконт паўнапраўнага ўключэння ў праграму Беларусі.

Пасля майскага саміту праграмы «Усходняе партнёрства» ў мінулым годзе афіцыйны Мінск актыўна падаваў на разгляд у Еўракамісію розныя праекты, каб атрымаць фінансаванне на іх рэалізацыю. Трэці сектар удзельнічаў у працы Форума грамадзянскай супольнасці, першым паседжанні Каардынацыйнага камітэта форума, і прадстаўнікі беларускіх НДА нават змаглі ўвайсці ў кіраўніцтва гэтай структуры. Аднак поспехі афіцыйнага і апазіцыйнага беларускага боку дагэтуль застаюцца адасобленымі, хаця праграма афіцыйна дзейнічае амаль год, унутранай камунікацыі паміж яе беларускімі ўдзельнікамі з розных ідэйных лагераў няма.

Для ўладаў Беларусі «Усходняе партнёрства» найперш цікавае сваім эканамічным складнікам, праектамі ў галіне транзіту, транспарту, энергетыкі. Але, як заяўляў Часовы паверены ў справах Еўрасаюза ў Мінску Жан-Эрык Хольцапфель, «Усходняе партнёрства» — гэта, па-першае, дэмакратыя і стабільнасць». З-за заходняй мяжы Мінску перыядычна адпраўляцца на гэты конт «сігналы» з чаканнем зваротных пазітыўных крокаў.

Да слова, цяпер падчас вышэйшых сустрэч фактычна не вядзецца размова наконт выканання ранейшых дванаццаці патрабаванняў ЕС па дэмакратызацыі Беларусі, а спіс быў скарочаны да пяці пунктаў — рэформа выбарчага заканадаўства, забеспячэнне свабоды аб'яднанняў, стварэнне ўмоў для дзейнасці няўрадавых арганізацый, свабода прэсы, зняцце абмежаванняў для свабоды асобы. Але і іх Мінск не выконвае ў поўным аб'ёме. Напрыклад, шырокі розгалас меў сёлетні канфлікт з незарэгістраваным Саюзам палякаў у Беларусі.

Пасля вынясення Вярхоўным судом рашэння па справе Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, а таксама Міхаіла Казлова прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі распаўсюдзіла заяву, у якой выказваецца «заклапочанасць паказаннямі сведак пра тое, што іх сведчанні былі атрыманыя пад фізічным і псіхалагічным ціскам», і «гэты працэс можа разглядацца ў якасці палітычна матываванага».

Атрымліваецца, што праз колькі гадоў пасля пачатку праграмы зрухі ў дыялогу маюць збольшага ідэйны змест, то бок цяпер Беларус не ўспрымаецца як цалкам ізаляваная ад Еўропы дзяржава. Але і само «Усходняе партнёрства» ў дачыненнях з нашай краінай паўстае ў рэжыме не паўнавартаснай, а навучальнай trial-версіі.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### НАВАПОЛАЦК. «ХРОНІКІ БЕЛАРУСІ»

12 мая ў бібліятэцы імя Я. Коласа мясцовая суполка ТБМ арганізавала чарговую прэзентацыю, у гэты раз кнігі «Хронікі Беларусі», і творчую сустрэчу з яе рэдактарам Васілём Вароніным.

«Кніга, якую рэдакцыя аддае ў рукі чытача, утрымлівае практычна ўсе вядомыя на сённяшні дзень беларуска-літоўскія летапісы. Яе змест укладзены на базе 32-га і 35-га тамоў Поўнага збору рускіх летапісаў і забяспечаны прадмовай, якую напісаў да іх Мікола Улашчык. У Дадатках змешчаны ўрыўкі з Іпацьеўскага, Наўгародскага, Пскоўскага першага, Пскоўскага другога, Пскоўскага трэцяга, Цвярскога летапісаў і Рагожскага летапісца, якія істотна дапаўняюць, а часам падаюць у зусім іншым святле тыя ці іншыя падзеі, адлюстраваныя ў летапісах айчыннага паходжання. Шмат у іх звестак, якія зусім адсутнічаюць у нашых летапісах», — так засведчыў у сваім выступе Варонін. Кніга пабачыла свет у выдавецтве ARCHE. Падчас імпрэзы аматары беларушчыны маглі набыць і іншыя кнігі выдавецтва.

### МЁРЫ. АБ'ЯДНАЛІ ПТУШКІ

Нядаўна паўночна-заходні рэгіён Беларусі наведалі прадстаўнікі літоўскага і шведскага арніталагічных таварystваў. Шэраг мерапрыемстваў быў праведзены ў рамках сумеснага праекта трох краін. Праект накіраваны на стварэнне сеткі захавальнікаў для трох беларускіх і трох літоўскіх зонаў пасялення птушак. З беларускага боку ўдзельнічаюць заказнікі «Налібоцкая пушча», «Сэрвач» і «Балота Ельня». Менавіта да развіцця сеткі захавальнікаў для апошніх двух і далучыліся замежныя госці.

Праграма была вельмі насычаная: для захавальнікаў «Балота Ельня» і «Сэрвач» быў арганізаваны семінар. Для пашырэння ведаў пра праграму ў трох школах (вёскі Чапукі і Дворнае сяло Мёрскага раёна, вёска Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна) прайшлі сустрэчы з вучнямі. На іх слухачы даведаліся пра цікавыя літоўскія і шведскія тэрыторыі, важныя для птушак.

### БРАСЛАЎ. ДАТА СВЯТА ВЫЗНАЧАНА

Сёлета Браславу спаўняецца 945 гадоў. Пасля доўгіх узгадненняў вызначана дата святкавання. Яно адбудзецца 29 мая. З гэтай нагоды Браслаўскае музейнае аб'яднанне пры падтрымцы гарадскіх улад ладзіць на Замкавай гары фестываль сярэднявечнай культуры пад назвай «Меч Брачыслава».

Падчас гістарычнай імпрэзы госці ўбачаць сапраўдны рыцарскі абоз, стануць сведкамі рыцарскіх турніраў. У свяце прымуць удзел майстры, якія працуюць у накірунку «жывой археалогіі» — адраджэння старадаўніх рамёстваў: ткацтва на вертыкальных кроснах, прадзенне на верацяне, выраб абутку і ташак са скуры ды іншых рамёстваў. На фестывалі будуць працаваць сапраўдныя археолагі, якія пакажуць спосабы кансервацыі керамікі і раскажуць пра методыку археалагічнага раскопу. Падчас фэсту будзе гучаць сярэднявечная музыка. На думку арганізатараў, «Меч Брачыслава» — першы фестываль сярэднявечнай культуры ў Беларусі, дзе будуць спалучаныя два рэканструктарскія накірункі: ваярства і старажытныя рамёствы.

▸ СПІС

## У ЧАРНАГОРЫЮ ПУСЦЯЦЬ НЕ ЎСІХ

**Да абмежавальных мер Еўрасаюза ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў далучыліся восем трэціх краін, паведаміла 11 мая прэс-служба Савета ЕС.**

Еўрасаюз вітаў гэта рашэнне Албаніі, Босніі і Герцагавіны, Ісландыі, Ліхтэнштэйна, Македоніі, Нарвегіі, Харватыі і Чарнагорыі. Краіны далучыліся да рашэння Савета ЕС ад 15 снежня 2009 года, калі ў ходзе тэхнічнай працэдуры да 31 кастрычніка 2010 года была прадоўжана забарона на ўезд у краіны ЕС 41 беларускаму чыноўніку. Да гэтай жа даты было прадоўжана прыпыненне санкцый у дачыненні да ўсіх, акрамя пяці, прадстаўнікоў афіцыйнага Мінска. Пасля заканчэння гэтага перыяду пытанне пра санкцыі будзе разглядацца з улікам сітуацыі ў Беларусі.

Нагадаем, спіс неўязных быў адкрыты ў 2004 годзе, туды трапілі чатыры падазроныя ў дачыненні да палітычных знікненняў у 1999–2000 гадах — экс-міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, былы дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, былы кіраўнік МУС Юрый Сівакоў і былы камандзір брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС Дзмітрый Паўлічэнка.

Пасля парламенцкіх выбараў у снежні 2004 года спіс быў пашыраны за кошт кіраўніка Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай, а таксама Юрыя Падабеда, які тады ўзначальваў полк міліцыі спецыяльнага прызначэння.

У красавіку 2006 года спіс быў пашыраны да 37 чалавек, адказных, на думку ЕС, за парушэнне правоў чалавека падчас прэзідэнцкай кампаніі. У яго былі ўключаны прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, на той момант кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Генадзь Нявыглас, яго намеснікі Наталля Пяткевіч і Анатоль Рубінаў, міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, экс-міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч, міністр юстыцыі Віктар Галаваноў, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі, былы старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Канаплёў, член Савета Рэспублікі Мікалай Чаргінец.

У кастрычніку 2006 года спіс павялічыўся да 41 чалавека: неўязнымі сталі суддзя суда Маскоўскага раёна Мінска Аляксей Рыбакоў і дзяржабвінаваўца Сяргей Бортнік — за прыгавор экс-кандыдату ў прэзідэнты Аляксандру Казуліну, а таксама суддзя суда Цэнтральнага раёна Мінска Леанід Ясіновіч і дзяржабвінаваўца Андрэй Мігун — за прыгавор актывістам незарэгістраванай арганізацыі «Партнёрства».

У кастрычніку 2008 года ЕС вырашыў часова прыпыніць санкцыі ў дачыненні да 36 чыноўнікаў. У спісе неўязных засталіся Ярмошына, Навумаў, Шэйман, Сівакоў і Паўлічэнка.

**Паводле БелаПАН**

▸ ПАМЯЦЬ

## ВАНДАЛІЗМ НЕ СПЫНЯЕЦЦА

**У Брэсце апаганены помнік вязням гета, паведаміў старшыня брэсцкай яўрэйскай абшчыны Барыс Брук.**

Паводле яго слоў, невядомыя ў ноч з 9 на 10 мая спалілі ўсе вянкі і кошыкі з кветкамі каля манумента, устаноўленага ў цэнтры горада, на скрыжаванні вуліц Дзяржынскага і Куйбышава.

«Гэта робіцца ўжо тры гады запар у адзін і той жа час — у ноч з 9 на 10 мая. Прычым вінаватых у тых двух выпадках не былі ўстаноўлены. З манумента сціраюцца сляды сажы ад пажару, але ў памяці людской зрабіць гэта немагчыма», — заявіў Брук. Як паведаміў кіраўнік абшчыны, 11 мая ён накіраваў ліст на імя старшыні Брэсцкага гарвыканкама з патрабаваннем прыняць адпаведныя меры.

Апаганены вандаламі мануменt устаноўлены ў памяць пра 34 тысячы загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны яўрэяў, якія жылі ў Брэсце і наваколлях.

**Паводле БелаПАН**

▸ КОНКУРС

## ПАДТРЫМКА ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў прадоўжыў тэрмін прыёму заявак на конкурс інвестыцыйных праектаў да 31 мая.**

Як паведамілі ў фондзе, пераможцам конкурсу будзе выдзелена дзяржаўная фінансавая падтрымка ў выглядзе пазыкі або давання маёмасці на ўмовах лізінгу (фінансавай арэнды). Максімальная сума дапамогі — 280 мільёнаў рублёў.

Удзельнічаць у конкурсе могуць індывідуальныя прадпрымальнікі, мікраарганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек і малыя арганізацыі (ад 16 да 100 работнікаў).

Асноўныя крытэры конкурснага адбору інвестыцыйных праектаў — адпаведнасць праекта прыярытэтным кірункам; актуальнасць і перспектыўнасць праекта, яго канчатковы вынік; запланаванае прыцягненне сродкаў для рэалізацыі праекта з іншых крыніц; колькасць запланаваных да стварэння новых працоўных месцаў і абгрунтаванасць іх стварэння.

**Паводле БелаПАН**

▸ ПАДЗЕЯ

## 600-ГОДДЗЕ ПЕРАМОГІ ПАД ГРУНВАЛЬДАМ

**Дэпутаты Сейму Літоўскай Рэспублікі прапанавалі беларускай грамадскасці правесці 14–18 ліпеня 2010 года сумеснае шэсце на Грунвальдскае (Дубровенскае) поле. Шэсце пачнецца з Гродна, адкуль у 1410 годзе войскі ВКЛ выпраўляліся на Грунвальдскую бітву.**

Беларусы прынялі прапанову. У Мінску створаны аргкамітэт святкавання 600-годдзя Вялікай Перамогі пад Грунвальдам. Старшыня гарадскога аргкамітэту — доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Грыцкевіч, намеснік старшыні аргкамітэту — мастак Мікола Купава.

Мяркуецца, што ва ўрачыстым шэсці з боку Беларусі прымуць удзел прадстаўнікі тых нашых старажытных гарадоў, з якіх у 1410 годзе на Грунвальдскім полі біліся рыцары 40 харугваў (палкоў): Аршанская, Берасцейская, Ваўкавыская, Віленская, Віцебская, Гарадзенская, Лідская, Медніцкая, Менская, Мсціслаўская, Навагрудская, Пінская, Полацкая, Смаленская, Старадубская, 10 асабістых харугваў Вітаўта і іншыя.

Паводле аргкамітэта, мінскія валанцёры ўжо пачалі выраб харугваў (сцягоў палкоў), эскізы якіх распрацаваныя суполкай мастакоў «Пагоня». Малюнкі на харугвах (цэнтрам кампазіцыі якіх зазвычай будзе вершнік) вырабляюцца метадам аплікацыі. Прынятыя памеры харугваў: 110х160 сантыметраў. Падобныя харугвы будуць вырабліцца ў шэрагу беларускіх гарадоў, якія далучацца да ўдзелу ў шэсці.

У рэканструкцыі Грунвальдскай бітвы, якая адбудзецца 17 ліпеня, прыме ўдзел каля 200 рыцараў беларускіх клубаў. На ролю Вітаўта Вялікага запрошаны выбітны акцёр аднаго з беларускіх тэатраў. Музычную падтрымку будзе ажыццяўляць беларускія гурты старажытнай музыкі.

З 15 да 18 ліпеня аргкамітэт рыхтуе паездку беларусаў на Дубровенскае поле двума аўтобусамі з Мінску. Мяркуецца, што ад Беларусі на Грунвальд рушаць каля 30 дэлегацый з гарадоў і мястэчак, якія прымалі ўдзел у Грунвальдскай бітве. Зараз вядзецца падрыхтоўка спісаў удзельнікаў выправы на гістарычнае для беларусаў і сакральнае для нашчадкаў ВКЛ месца.

У межах адзначэння 600-годдзя Вялікай Перамогі пад Грунвальдам у Мінску запланавана правядзенне круглага стала з удзелам вядомых гісторыкаў, урачыстае святкаванне ў кавярні «Грунвальд» 15 ліпеня, асвячэнне выраблены валанцёрамі харугваў і тэматычныя выставы твораў беларускіх мастакоў.

Арганізатары святочных мерапрыемстваў з удзячнасцю прымуць любую фундатарскую дапамогу ад арганізацый і прыватных асобаў. Найлепшыя спонсары будуць уганараваны правам суправаджаць князя Вітаўта падчас рэканструкцыі Грунвальдскай бітвы. Кантактныя тэлефоны: (+375 29) 551 32 36, 335 24 94.

Рэспубліканскі грамадскі арганізацыйны камітэт па святкаванню 660-годдзя Вітаўта Вялікага і 600-годдзя Грунвальдскай (Дубровенскай) Перамогі.

▸ ГОНАР

## ЗАХАВАЦЬ ФАЛЬВАРАК

**Антон Астаповіч прапанаваў Міністэрству культуры надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці рэштκам фальварка Жлобаўцы ў Ваўпянскім сельсавеце Ваўкавыскага раёна. Тут 9 жніўня 1910 года нарадзілася паэтка Ларыса Геніюш (у дзявоцтве Міклашэвіч).**

У сваім лісце, накіраваным у Мінкультуры 11 мая, старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Астаповіч выказаў спадзяванне, што прапанова будзе разгледжана і не пакінута без станоўчага вырашэння ў межах святкавання 100-годдзя са дня нараджэння вядомай беларускай паэткі.

Рэшткі фальварка Жлобаўцы знаходзяцца паміж вёскамі Длугаполь і Палоўкі, побач з шашой Воўпа — Стары Дварэц. Уладальнік тэрыторыі былога фальварка — СВК «Агра-Лозы». Рэшткі складаюцца з падмуркаў сядзібнага дому і гаспадарчай пабудовы.

З пачатку ХХ стагоддзя і да верасня 1939 года фальварак належаў Міклашэвічам. Пасля быў нацыяналізаваны, а на пачатку 1947 года прададзены Ваўпянскім сельсаветам Ваўкавыскаму дарожна-рамонтна-будаўнічаму ўпраўленню, разабраны, перавезены ў Ваўкавыск, дзе знаходзіцца па вуліцы Перамогі, 40.

**Паводле БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЯК ЗРАБІЦЬ ПРАВІЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ?

*Сяргей САЛАЎЁЎ*

**Здаецца, нашае сяброўства з Расіяй скончылася. Аляксандру Рыгоравічу не падабаецца ўсё. Пазіцыя АДКБ, пазіцыя Расіі, пазіцыя ўсяго СНД.**

Па-першае, як стала вядома, Аляксандр Лукашэнка прывёз на нефармальны саміт лідэраў краін — удзельніц АДКБ, які адбыўся 8 мая ў Маскве, заяву Курманбека Бакіева, у якім той заклікае ўвесці ў Кыргызстан ваенны кантынгент.

Па дадзеных выдання «Время новостей», падчас жорсткай дыскусіі гэту прапанову адкінулі. Замест яе была прынятая заява кіраўнікоў дзяржаў — сяброў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, у якой «падзеі красавіка ў Кыргызскай Рэспубліцы, што прывялі да неканстытуцыйнай змены ўлады», разглядаюцца сябрамі АДКБ «унутранай справай» гэтай краіны.

Раней Лукашэнка назваў бесперспектыўнай далейшую дзейнасць АДКБ, паколькі арганізацыя не рэагуе на «дзяржаўны пераварот у адной з краін-сябраў».

Што гэта азначае? Няўжо канец нашаму ўдзелу ў АДКБ, а таксама ва ўсіх праектах АДКБ, кшталту Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання? Гэта значыць, што Беларусь таксама не будзе дасылаць у якасці складніка гэтых сілаў беларускіх жа вайскоўцаў, каб яны ваявалі невядома за чые інтарэсы, невядома на чыёй зямлі? Гэта было б цудоўна.

На парадзе з нагоды перамогі ў Мінску Лукашэнка зноў ускосна пацвердзіў гэтую тэзу. Бо ён, як заўжды, казаў пра незалежнасць.

Дзень Перамогі для беларускага народа лёсавызначальны, заявіў Аляксандр Лукашэнка 9 мая на парадзе войск Мінскага гарнізона з нагоды 65-й гадавіны перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь у ваеннае ліхалецце пацярпела як ні адна краіна ў свеце. У выніку бесчалавечнага генацыду яна страціла трэціну насельніцтва. Была знішчана ўся інфраструктура, пра якую нагадваў толькі попел спаленых вёсак і руіны калісьці квітнеючых гарадоў.

«Тады, у 1941-м, адбылося не проста сутыкненне дзяржаў і велізарных ваенных патэнцыялаў. Гэта была ўсёабдымная бітва розных палітычных сістэм, супрацьлеглых маральных і духоўных каштоўнасцяў. І мы атрымалі ў ёй перамогу. На абарону Айчыны падняўся ўвесь народ. Менавіта таму гэтая вайна навекі ўвайшла ў гісторыю як Вялікая Айчынная вайна», — сказаў прэзідэнт Беларусі.

«І сёння ў парадным страі ў Мінску, Маскве і Кіеве плячо ў плячо стаяць ваеннаслужачыя брацкіх славянскіх краін. Памяць пра гераічны подзвіг святая. Аднак, каб пазбегнуць трагічных памылак, з вопыту мінулага неабходна зрабіць правільныя высновы», — адзначыў прэзідэнт.

«Мы заклікаем усе краіны свету не ігнараваць новыя выклікі і небяспечныя тэндэнцыі, якія пагражаюць нашай бяспецы. <...> Каштоўную спадчыну — свабоду і незалежнасць — трэба не толькі паважаць, але і абараняць ад палітычных і эканамічных пагроз любымі сродкамі», — заявіў Лукашэнка.

Паводле меркавання кіраўніка дзяржавы, складанае сучаснае становішча выстаўляе павышаныя патрабаванні да ўмацавання абараназдольнасці дзяржавы. «Для гэтага мы прымаем усе неабходныя меры. Асноўная ўвага — забеспячэнне неабходнага ўзроўню развіцця Узброеных сіл», — сказаў ён.

Калісьці, гадоў з 10 таму, я рабіў інтэрв'ю з вядомай расійскай дысідэнткай Валерыяй Навадворскай. І ўжо тады яна мне казала: «Пройдзе год пяць, і Лукашэнка будзе абараняць сваю незалежнасць са зброяй у руках, у якасці партызана». Тады гэта падавалася фантастыкай. Зараз — свабоду і незалежнасць трэба абараняць любымі сродкамі. «У зямлянкі пойдзем, але на калені не станем», — адразу ўзгадваецца знакаміты выраз.

Пытанне толькі, ад каго абараняць? Здаецца, пагрозы з Захаду няма. Хіба толькі з Усходу? Ад тых самых сілаў АДКБ?

Дарэчы, Захад таксама падклаў маленькую свінню Беларусі. Савет Еўропы лічыць неабходным развіваць дыялог з Беларуссю, але пакуль не бачыць для гэтага магчымасцяў, у тым ліку з прычыны нядаўніх двух смяротных пакаранняў у краіне.

У той жа час, адказваючы на пытанне, ці магчыма змена адносін паміж Саветам Еўропы і Беларуссю пры цяперашнім кіраўніцтве краіны, Ягланд сказаў: «Савет Еўропы не займаецца зменай рэжымаў. Усё залежыць ад самога народа гэтай краіны».

Так што навалы з Захаду Аляксандру Рыгоравічу палохацца не трэба. Яе не будзе. У гэтым выпадку можна спакойна займацца выбарамі. І першы крок для іх правядзення ўжо зроблены. Лукашэнка рыхтуе IV Усебеларускі сход.

Загад пра стварэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы чарговага Усебеларускага сходу змешчаны ў распараджэнні ад 11 мая 2010 года. Як паведамляе АФН, кіраваць аргкамітэтам прызначаны кіраўнік Адміністрацыі Уладзімір Макей і прэм'ер міністр Сяргей Сідорскі. Аляксандр Лукашэнка даручыў ім да 1 ліпеня 2010 года падрыхтаваць прапановы па даце правядзення сходу і колькасці яго ўдзельнікаў. Выказваецца меркаванне, што па выніках сходу будзе дадзены афіцыйны старт прэзідэнцкай выбарчай кампаніі.

Ды што там «меркаванне»! Заўсёды выбарам папярэднічаў Усебеларускі сход. Таму, найперш, да гэтага трэба рыхтавацца апазіцыі. І не разлічваць на тое, што выбары пройдуць у тэрмін. Хутчэй за ўсё, выбары будуць датэрміновыя.

А цалкам можа быць і тое, што Аляксандру Лукашэнку надакучыла быць прэзідэнтам. І тады каранацыя будзе прызначаная імем народа. Прыкладна, на чацвер. А на які — яшчэ невядома.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІХАІЛ СНЯГІР


Photo.ByMedia.Net

Экс-пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір асуджаны на сем гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Таксама ў яго забралі дом побач з Цнянскім вадасховішчам і пяціпакаёвую кватэру ў сталіцы, былога пракурора пазбавілі чыну дзяржаўнага дарадца юстыцыі трэцяга класа і забаранілі яму на працягу пяці гадоў займаць кіруючыя пасады на дзяржслужбе.

Суд прызнаў Снегіра вінаватым у злоўжыванні ўладай або службовымі паўнамоцтвамі, атрыманні хабару, пазапраўных дзеяннях з агнястрэльнай зброяй, боепрыпасамі і выбуховымі рэчывамі, а таксама ў перавышэнні ўлады або службовых паўнамоцтваў.

Прысуд Снягір назваў ганьбай і своеасаблівай падзякай за доўгія гады бездакорнай службы. Ён таксама дадаў: «Каб нас пасадзіць, зацікаўленыя людзі насілі мяхі грошай». Экс-пракурор заявіў, што яго пасадзіла мафія, якая адабрала ўсё, нават сподні крыжык, пасля чаго выгукнуў: «Ганьба!» — піша электронная газета «Ежедневник». Снягір у час сваёй працы намеснікам генеральнага пракурора даваў санкцыю на затрыманне афіцэра Дзмітрыя Паўлічэнкі, якога падазраюць у выкраданні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзмітрыя Завадскага.

Другі фігурант гэтай справы — былы генеральны дырэктар ААТ «Забудова» Міхаіл Кудзелка прызнаны вінаватым у даванні хабару і злоўжыванні ўладай або службовымі паўнамоцтвамі. Суд асудзіў яго да трох з паловаю год пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з арганізацыйна-распарадчай дзейнасцю на працягу чатырох гадоў.

### УЛАДЗІМІР ЛІПСКІ



Беларускі журналіст і пісьменнік Уладзімір Ліпскі адзначае сваё сямідзесяцігоддзе. Уладзімір Ліпскі вядомы найперш творамі для дзяцей, а таксама працай у беларускамоўным дзіцячым часопісе «Вясёлка», які рэдагуе ад 1978 года. Узначальвае таксама Беларускі дзіцячы фонд. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Уладзімір Сцяпанавіч — беларускі пісьменнік, які атрымаў расійскую прэмію імя Аляксандра Грына. Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Уладзімір Ліпскі з'яўляецца ініцыятарам і нязменным старшынёй журы Усебеларускіх фестываляў народнага гумару ў Аўцюках, якія далі штуршок для правядзення падобных рэгіянальных святаў у Спораве Бярозаўскага, Дубіна Валожынскага і Баянічах Любанскага раёнаў.

Аўтар дзіцячых кніг «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», «Лаўрэнавы працадні», кніг публіцыстыкі «Знайдзі сябе», «Крутыя вёрсты», шэрагу аповесцяў.

### АРТУР ЛЯСЬКО



Беларускі галкіпер Артур Лясько стаў уладальнікам Кубка Арменіі ў складзе клуба «Пюнік». У фінальным матчы 10 мая чэмпіён краіны з лікам 4:0 выйграў у «Бананца». 25-гадовы футбаліст Лясько правёў у варотах увесь матч. У «Пюніку» беларускі легіянер выступае з 2010 года.

Раней Артур гуляў за мінскае «Дынама» і крыварожскі «Крыўбас». З'яўляўся адным з самых перспектыўных футбалістаў Беларусі свайго ўзросту. У 2004 разам з камандай выйграў чэмпіянат Беларусі. Таксама ў камандзе правёў 8 матчаў у еўракубках. У камандзе меў мянушку Ліс.

Гульнявую кар'еру ў крыварожскай камандзе футбаліст узгадвае нядобрым словам: «У «Крыўбасе» мне папросту не давалі гуляць. Прычым у апошні год не толькі за асноўную каманду, але і за дубль… Гэта значыць, «Крыўбас» пазбавіў мяне футбола на два гады. Футболу ў самым шырокім значэнні гэтага слова: я толькі трэніраваўся, і ўсё. А любому футбалісту не проста хочацца гуляць — гульнявая практыка вельмі неабходная».

З сакавіка гэтага года Артур Лясько гуляе за армянскі «Пюнік».

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# БЕЛАРУСКІ ДАРЭНДОРФ

Сяргей НІКАЛЮК

**Апазіцыя спадзяецца на «Плошчу» не таму, што кепска засвоіла еўрапейскія каштоўнасці, а праз сярэднявечную прыроду беларускай Улады.**



Прафесар Вячаслаў Оргіш у трылогіі, апублікаванай у «*Советской Белоруссии*», зноў выказаў свой непакой наконт лёсу беларускай апазіцыі. Як «сапраўдны дэмакрат», ён не сумняваецца ў неабходнасці апазіцыі, аднак іншай — такой, якая падтрымлівае «прававую культуру краіны» і здольная «быць канструктыўным фактарам грамадскай згоды і развіцця». Таму прафесар прапаноўвае апазіцыі заняцца пошукам «нішы ў сістэмным палітычным жыцці», а не канфліктаваць з рэжымам.

Рэвалюцыйны дагматызм сёння ўжо не модны. Заходнія палітыкі «бегаюць ад яго як чорт ад ладану», а нашы («ахвяры светапогляднай і ідэалагічнай архаікі») усё ніяк не могуць пазбавіцца ад мыслення ў марксісцкіх катэгорыях супрацьстаяння працоўных і капіталістаў. Адсюль неразуменне сваёй сацыяльнай базы і, як следства, узровень падтрымкі ў грамадстве ў межах 3–5 працэнтаў.

## У пошуках сацыяльнай базы

Гэты сумны пералік можна працягваць, аднак і працытаванага з лішкам хопіць на некалькі «Азбук паліталогіі». Пачну з прававой культуры краіны, якую апазіцыя не хоча падтрымліваць. У чым яе асноўная асаблівасць? Звярнуся па дапамогу да вядомага па школьным курсе літаратуры графа Бенкендорфа: «Закон пішацца для падданых, а не для дзяржавы».

Прыклады доўга шукаць не давядзецца. Дастаткова прыгадаць красавіцкія выбары. Асабліва дапытлівым нагадаю, што сваю дзейнасць на пасадзе кіраўніка дзяржавы Лукашэнка пачаў з прыняцця каля двух дзесяткаў антыканстытуцыйных дэкрэтаў. Гэта не мая ацэнка. Гэта ацэнка Канстытуцыйнага суда.

Вядомы душыцель свабоды з далёкага XIX стагоддзя фармуляваў сваё прававое крэда наступным чынам: законы — сродак кіравання, а не сродак абароны людзей ад урада. З тых часоў мінула амаль дзвесце гадоў, але што змянілася? Ці з'яўляецца такога кшталту прававая культура светапогляднай і ідэалагічнай архаікай, або, наадварот, яе варта разглядаць у якасці своеасаблівага ноу-хау беларускай Улады?

А зараз наконт няздольнасці апазіцыі заняцца пошукам «нішы ў сістэмным палітычным жыцці». Задача па знаходжанню такой нішы нагадвае пошук чорнай коткі ў чорным пакоі, калі яе там няма. У Беларусі, згодна з афіцыйнай дактрынай, — толькі адзін палітык. Дык пра якое палітычнае жыццё мы спрачаемся?

Палітычнае жыццё пачынаецца з прызнання права розных сацыяльных груп на інтарэсы, якія адрозніваюцца ад інтарэсаў дзяржавы. Гэта — азбука паліталогіі, аднак беларускай уладай яна дагэтуль не засвоеная. У якасці прыкладу прывяду словы Лукашэнкі, сказаныя ім на ўрачыстым пасяджэнні Сінода Беларускай праваслаўнай царквы: «*Сильная власть является залогом незыблемости положения Православной церкви в обществе*».

Пагадзіцеся, не слаба! Якая ўжо тут апазіцыя, калі нават Праваслаўная царква сваім становішчам у грамадстве ў нас абавязаная дзяржаве! Гэта ў Евангеллі «кесарава Кесару, а Богу Божае». У Беларусі ж — усё Кесару. Крок направа, крок налева, а далей... самі разумееце.

У беларускай апазіцыі, як сцвярджае Оргіш, адсутнічае сацыяльная база (зрэшты, паводле Лукашэнкі, яна адсутнічае і ў Праваслаўнай царквы). Пры гэтым прафесар спасылаецца на апытанні НІСПД. Смешна. Асноўная тэма даследаванняў НІСПД — структура беларускага грамадства. Практычна ў кожным штоквартальным даследаванні інстытута падкрэсліваецца, што апазіцыйная частка беларускага грамадства складае не менш за 30 працэнтаў. Каб гэта не заўважыць, неабходна мець не толькі жаданне, але і здольнасці. Зрэшты, і першага, і другога ў прафесара больш чым дастаткова.

Каб пацвердзіць сваю рацыю, прафесар прыводзіць індэксы даверу да прэзідэнта (суадносіны розніцы паміж адказамі «давяраю» і «не давяраю» да агульнай колькасці апытаных). Сапраўды, за 2009 год яны павялічыліся — з 0,074 да 0,142. Але пяройдзем ад індэксаў да табліцы, па якой яны разлічваліся (табліца 2). Як можна было не заўважыць, што за мінулы год колькасць тых, хто не давярае прэзідэнту, не апускалася ніжэй 35,3 працэнта, а колькасць тых, хто не ўхваляе курс Лукашэнкі, — ніжэй 31,0 працэнта (табліца 1)!

Хто гэтыя людзі? У першую чаргу, маладыя, адукаваныя жыхары вялікіх гарадоў. У сакавіку 2010 года сярод узроставай групы ад 18 да 30 гадоў не ўхвалялі курс развіцця краіны 49,0 % рэспандэнтаў, а сярод тых, хто старэй за 60 гадоў, — 16,2 %. Аналагічная карціна і з адукацыяй: вышэйшая — 41,5 %, пачатковая — 15,0 %. Вось гэтыя людзі і з'яўляюцца сацыяльнай базай апазіцыі. Дык прычым тут працоўны клас, на які ўвесь час спасылаецца прафесар філасофіі?

## Архаічная ўлада, а не апазіцыя

Прывяду ключавую цытату з Оргіша: «...Асноўны парадокс і супярэчнасць апазіцыі заключаецца ў тым, што яна хоча навязаць грамадству заходнюю логіку сацыяльнага кіравання, заснаваную на дэмакратычнай канцэпцыі ўлады. Аднак для дасягнення гэтай мэты яе лідэры выкарыстаюць стратэгію, якую Захад катэгарычна адмаўляе». Калі пад стратэгіяй апазіцыі разумець «Плошчу», то з прыведзенай цытатай варта пагадзіцца.

**Неканкурэнтаздольная ўжо хаця б праз сваю архаічную прыроду, беларуская дзяржава спадзяецца стварыць канкурэнтаздольную эканоміку. Такія спробы ў гісторыі рабіліся неаднаразова і заўсёды заканчваліся крахам**

Для пацверджання «асноўнага парадоксу» апазіцыі прафесар Оргіш спасылаецца на аўтарытэт «найбуйнейшага сацыяльнага філосафа сучаснасці Ральфа Дарэндорфа», паводле якога суб'екты палітычнага жыцця Еўропы прызнаюць наяўнасць канфліктаў і спрабуюць «папярэджваць развіццё іх негвалтоўных формаў». Карацей, разумнікі на Захадзе выступаюць за «эвалюцыйную рэканструкцыю таго стану рэчаў, які склаўся», а ў нашых апазіцыйных недавучак, што засвоілі толькі асновы марксізму, «упор робіцца на рэвалюцыйны злом».

У маім кампутары ёсць папка «Пасланні». Калі ўключыць пошукавік і набраць слова «адмарозкі», то адразу з'явяцца дзве спасылкі: Пасланне–2002 і Пасланне–2009. Далей знайсці адпаведную цытату элементарна. Адкрыем першую спасылку: «*Это что, оппозиция? Это, правильно народ назвал, «отморозки», иначе их не назовешь*». А зараз я хачу спытаць у прыхільніка Дарэндорфа, якім чынам прадстаўнікам апазіцыі варта займацца «пошукам кансенсусу» з аўтарам падобнага выказвання?

За апошнія гады Лукашэнка неаднаразова цытаваў Леніна наконт улады, якая толькі тады чагосьці вартая, калі ўмее абараняцца. У Леніна, дарэчы, гаворка ішла не пра ўладу, а пра рэвалюцыю. Цікава, наколькі такое цытаванне спалучаецца з сучаснай тэндэнцыяй папярэджваць развіццё негвалтоўных формаў палітычных канфліктаў? Вось, да прыкладу, у Вялікабрытаніі 6 мая адбыліся парламенцкія выбары. Уявіце сабе, што нешта падобнае напярэдадні выбараў заявіў бы дзейсны прэм'ер-міністр. Уявілі?

У Беларусі архаічная Улада, а не апазіцыя. І гэта цудоўна, што апазіцыя «адчувае сваю сацыяльную чужароднасць кіроўнай эліце». Лідэрам гэтай эліты з'яўляецца чалавек, які адкрыта абвяшчае пра нежаданні весці краіну за цывілізаваным светам. Вы скажаце: калі ж гэта было...

Апошні раз — 20 красавіка гэтага года. Чытайце тэкст паслання: «Мы никуда не должны идти — ни в Европу, ни в Америку, ни в Россию». Мы самі па сабе. Гэтакі еўрапейскі варыянт Гаіці.

Дарэндорфа, спадар прафесар, трэба не пачытваць, а чытаць уважліва. Яго асноўная думка не ў тым, што сучасныя грамадствы навучыліся вырашаць канфлікты ў негвалтоўнай форме, а ў тым, што «сучасны сацыяльны канфлікт — гэта антаганізм правоў і іх забеспячэння». У Беларусі Улада зрабіла ўпор на матэрыяльнае забеспячэнне падданых, і тое на мінімальна прымальным узроўні, і забыла пра правы грамадзян. Тым самым яна пазбавіла актыўных беларусаў «жыццёвых шанцаў». А гэта, паводле Дарэндорфа, з'яўляецца цэнтральным паняццем «для нашага разумення эпохі мадэрну».

## Вакол ворагі

У трэцяй частцы трылогіі прафесар па дапамогу да Дарэндорфа ўжо не звяртаецца, і апісанне беларускай рэальнасці ад гэтага толькі выйграла. У цэнтры апісання — дзяржаўная Улада. Перад яе партрэтам, напісаным упэўненымі мазкамі прафесіянала, я гатовы зняць капялюш. Мяркуеце самі: «Моцная і кансалідаваная, яна выявіла здольнасць прынцыпова ўплываць на алгарытмы паводзін розных грамадскіх суб'ектаў, у тым ліку прадпрымальніцтва».

Але, нягледзячы на сваю сілу, Улада аддае перавагу выбудоўванню сваіх адносін з грамадскімі суб'ектамі ў рамках «негалоснай дамовы», што варта разглядаць як яшчэ адну важную характарыстыку «прававой культуры краіны». Наступная цытата перадае сутнасць негалоснай дамовы, што заключыла Улада з бізнесам: «Прадпрымальнік быў пастаўлены перад жорсткай умовай: хочаш займацца бізнесам — не лезь у палітыку. Калі ты хочаш гуляць у апазіцыйныя палітычныя гульні — калі ласка, аднак не спадзявайся, што палітычная сістэма будзе абыякава глядзець на тое, як пад яе робяць падкоп».

Пры чытанні падобнага адкрыцця згадваецца курс гісторыі для сярэдняй школы. Канец сярэднявечча. Буржуазія ўжо назапасіла эканамічны «тлушчык», але ўсё яшчэ застаецца бяспраўным «трэцім саслоўем». Няма нічога дзіўнага ў тым, што ў сучаснай Беларусі, як і ў Еўропе часоў позняга сярэднявечча, дасягнула поспеху тая частка буржуазіі, «якая зразумела і прыняла ўмовы негалоснай дамовы», навязанай бізнесу і грамадству Уладай.

У прыведзенай вышэй цытаце варта звярнуць увагу на яшчэ адзін важны момант: улада разглядае любую палітычную дзейнасць як падкоп пад сябе. Таму «грамадская згода», па меркаванні прафесара Оргіша, можа быць усталявана толькі на ўмовах Улады. Што пры гэтым застаецца рабіць апазіцыі, якой мусіць быць яе стратэгія? Яна павінна складацца з трох паслядоўных дзеянняў: па-першае, апазіцыі варта «зачахліць сцягі», па-другое, «зачыніць офісы», па-трэцяе, «разысціся па хатах»! Дадзены трыпціх можа быць зведзены да лаканічнай формулы: «перастаць блытацца пад нагамі».

Вось тады і надыдзе ўсеагульнае шчасце. У ролі яго адзінага генератара выступіць родная сярэднявечная дзяржава. Яна і павядзе пазбаўленых палітычных правоў беларусаў у будучыню. Неканкурэнтаздольная ўжо хаця б праз сваю архаічную прыроду, беларуская дзяржава спадзяецца стварыць канкурэнтаздольную эканоміку.

Такога кшталту спробы ў гісторыі рабіліся неаднаразова і заўсёды заканчваліся крахам. Таму дарэмна наш прафесар нападае на апазіцыю, якая абапіраецца «ў палітычных справах на палітычныя тэхналогіі XIX стагоддзя». Тэхналогіі, на якія абапіраецца Улада, страцілі сваю эфектыўнасць значна раней.

**ТАБЛІЦА 1. ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «НА ВАШ ПОГЛЯД, У ЦЭЛЫМ СІТУАЦЫЯ Ў НАШАЙ КРАІНЕ РАЗВІВАЕЦЦА Ў ПРАВІЛЬНЫМ НАКІРУНКУ АБО Ў НЯПРАВІЛЬНЫМ?», %**

| Варыянт адказу | 06'06 | 09'08 | 12'08 | 03'09 | 06'09 | 09'09 | 12'09 | 03'10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У правільным | 56,9 | 53,4 | 45,3 | 40,0 | 47,9 | 53,3 | 47,2 | 49,5 |
| У няправільным | 31,0 | 30,0 | 34,0 | 34,9 | 33,6 | 31,0 | 32,0 | 35,6 |
| Цяжка адказаць/ няма адказу | 12,1 | 16,6 | 20,7 | 25,1 | 18,5 | 15,7 | 20,8 | 14,9 |

**ТАБЛІЦА 2. ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «ЦІ ДАВЯРАЕЦЕ ВЫ ПРЭЗІДЭНТУ БЕЛАРУСІ?», %**

| Варыянт адказу | 11'06 | 06'08 | 12'08 | 03'09 | 06'09 | 09'09 | 12'09 | 03'10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Давяраю | 60,3 | 47,3 | 48,4 | 45,4 | 50,6 | 49,2 | 50,9 | 49,8 |
| Не давяраю | 26,0 | 39,5 | 34,1 | 38,1 | 35,3 | 37,2 | 36,8 | 37,0 |
| Цяжка адказаць/ няма адказу | 13,7 | 13,2 | 17,5 | 16,5 | 14,1 | 13,6 | 12,3 | 13,2 |

СМІ

# ЖУРНАЛІСТЫ СХАДЗІЛІ Ў МІНІНФАРМ

Генадзь КЕСНЕР

**Прадстаўнікі трох незалежных выданняў, якім Міністэрства інфармацыі Беларусі неаднойчы адмаўляла ў рэгістрацыі, 12 мая наведалі першага намесніка кіраўніка гэтага ведамства Лілію Ананіч. Па выніках гэтых сустрэч, якія адбываліся паасобку, візітоўцы выклалі свае ўражанні на прэс-канферэнцыі ў сядзібе ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў».**



Лілію Ананіч за адзін дзень, па чарзе, наведалі прадстаўнікі віцебскай недзяржаўнай газеты «Наш дом» Вадзім Баршчэўскі, наваполацкага выдання «Химик. Два города» Сяргей Балай, а таксама газеты «Солигорск плюс» Уладзімір Шыла. Да таго ж, асобна Лілія Ананіч прыняла старшыню Асветніцкай установы «Цэнтр прававой трансфармацыі» юрыста Алену Танкачову. Галоўнай тэмай сустрэч прадстаўнікі азначаных выданняў бачылі высвятленне прычын адмовы Мініфармам у рэгістрацыі незалежных газет.

Па словах намесніка рэдактара газеты «Наш дом» Вадзіма Баршчэўскага, пра гэта друкаванае выданне Лілія Ананіч увогуле не захацела размаўляць, спаслаўшыся на тое, што 20 мая Вышэйшы Гаспадарчы суд Беларусі будзе разглядаць касацыйную скаргу (http://baj.by/m-p-viewpub-tid-1-pid-8213.html) заснавальнікаў газеты акурат з нагоды адмовы выданню ў дзяржаўнай рэгістрацыі.

Пасля гэтага Вадзім Баршчэўскі паспрабаваў перавесці размову на выданне «Витебский курьер», якое зарэгістравана ў Расіі і не мае магчымасці распаўсюджвацца ў Беларусі. Пра гэту газету намесніца міністра таксама размаўляла неахвотна, маўляў, тэмай гутаркі мусіла быць выданне «Наш дом». Але на пытанне Вадзіма Баршчэўскага, ці занесены «Витебский курьер» у спісы забароненых для распаўсюду выданняў, Лілія Ананіч дала адмоўны адказ.

Дарэчы, разам з удзельнікамі сустрэч з першай намесніцай міністра інфармацыі на прэс-канферэнцыі прысутнічаў дырэктар прадпрыемства, якое заснавала абодва віцебскія выданні (прыватнае прадпрыемства «Віцебскі корунд») Віктар Рамнёў, якога толькі за некалькі апошніх месяцаў за распаўсюд «Витебского курьера» аштрафавалі на агульную суму больш як пяць мільёнаў беларускіх рублёў.

Заснавальнік газеты «Химик. Два города» Сяргей Балай паведаміў, што яго заявы аб рэгістрацыі выдання Міністэрства інфармацыі паспела адхіліць ужо тры разы. Па словах Балая, кожным разам гэта адбывалася з розных прычын. Тым не менш, Сяргей Балай мае намер падаць паперы на рэгістрацыю ў Міністэрства інфармацыі яшчэ раз.

Пры размове з першай намесніцай міністра інфармацыі Сяргей Балай выказаў шэраг прэтэнзій адносна працы міністэрства, якое, з яго пункту гледжання, замаруджвае фармальна простую працэдуру рэгістрацыі.

Напрыклад, дакументы на рэгістрацыю прымаюцца толькі два разы на тыдзень, у той час як раней адпаведная служба працавала штодня. «Я жыву ў Наваполацку, і ездзіць кожны раз у Мінск, каб выправіць нейкую памылку, — гэта вельмі дорага, да таго ж, гэта вымагае шмат часу», — сказаў Сяргей Балай.

У Міністэрстве інфармацыі, па словах журналіста, да сённяшняга дня няма службы «адно вакно», што, як лічыць журналіст, супярэчыць адпаведным нарматыўным актам, выдадзеным прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Апроч таго, замест паўнавартасных кансультацый супрацоўнікі міністэрства адсылаюць заяўнікаў на сайт Мінінфарму, дзе ёсць пэўныя недакладнасці, якія ў выніку таксама робяцца прычынай адмовы незалежным выданням у дзяржаўнай рэгістрацыі.

Па словах Балая, нягледзячы на малую верагоднасць практычнага выніку гэтага візіту да Лілії Ананіч, усё ж сэнс у кансалідаваных дзеяннях на перспектыву ёсць. «Прынамсі, тры чалавекі ў адзін дзень звярнуліся разам да чыноўнікаў і паспрабавалі давесці, што проста хацелі б рабіць сваю працу… Незалежныя выданні ствараюць канкурэнцыю для дзяржаўных газет і вымушаюць іх варушыцца, быць больш якаснымі, што прызнала і сама намесніца міністра інфармацыі. Да таго ж, мы б стваралі новыя працоўныя месцы, плацілі б падаткі, і гэта было б толькі на карысць нашай дзяржаве», — мяркуе журналіст.

«Я ўпэўнена, што сумесныя, скаардынаваныя і публічныя дзеянні, накіраваныя на арганізацыю працэсу рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, — гэта тое, што павышае шансы рэгіянальных СМІ быць зарэгістраванымі. Я не кажу «гарантуе», бо гарантаваць нічога нельга, але павышае», — адзначыла старшыня Асветніцкай установы «Цэнтр прававой трансфармацыі» Алена Танкачова.

Варта дадаць, што газета «Новы час», якую вы зараз чытаеце і якая афіцыйна зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Беларусі, тым не менш не мае магчымасці распаўсюджвацца праз дзяржаўныя сеткі «Белсаюздрук» і «Белпошта», як і яшчэ тузін незалежных грамадска-палітычных выданняў. Так што нават дзяржаўная рэгістрацыя ў Міністэрстве інфармацыі не вырашае ўсе праблемы недзяржаўнай прэсы, якіх значна больш, чым у фінансуемых з бюджэту, гэта значыць, з кішэні падаткаплатнікаў сродкаў масавай інфармацыі.

САЦЫЯЛОГІЯ

# ТАЛЕРАНТНЫЯ ПРАГМАТЫКІ

Вольга ХВОІН

**Беларускае грамадства ў сваім геапалітычным выбары кіруецца прагматычнымі разлікамі — такія высновы сумеснай сацыялагічнай працы «Беларусь і свет: геапалітычны выбар і бяспека скрозь прызму эканомікі і культуры», праведзенай Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў і лабараторыяй аксіяметрычных даследаванняў «НовАК».**

Сацыёлагі гавораць, што цяпер беларусы аб'ектыўна ацэньваюць магчымыя рызыкі, калі б краіна ўвайшла ў зону ЕС. Каштоўнасная матывацыя геапалітычнага выбару адсутнічае амаль цалкам. Мы сталі прагматыкамі. Палітычны хаўруснік Беларусі — не той, хто будзе спрыяць умацаванню культуры ці вяртанню ў часы СССР, а той, хто палепшыць эканамічнае становішча ў краіне (55,1 працэнта апытаных), а таксама паспрыяе ўмацаванню бяспекі, міру і стабільнасці (17,8 працэнта рэспандэнтаў).

Да шырока разрэкламаванай у тым ліку і ўладамі праграмы «Усходняе партнёрства» ў апытаных такое ж меркантыльнае стаўленне: 59,4% чакаюць, што павялічыцца тавараварот з ЕС, 47,6% разлічваюць, што палепшыцца агульная эканамічная сітуацыя, 53,6% спадзяюцца на паляпшэнне адукацыйных магчымасцяў, 40,5% — на паслабленне візавага рэжыму. Разам з тым даследаванне паказала, што ў краіне захоўваецца крайне нізкі ўзровень разумення інстытуцыйных узаемасувязей Беларусі і ЕС.

У прыватнасці толькі траціна апытаных ведае, што Беларусь удзельнічае ў праграме «Усходняе партнёрства», кожны пяты памылкова думае, што наша дзяржава з'яўляецца сябрам Савета Еўропы, і амаль палова рэспандэнтаў (47%) мяркуюць, што Беларусь удзельнічае ў Еўрапейскай палітыцы добрасуседства, хаця насамрэч не.

Сацыёлагі канстатуюць правал камунікацыйнай палітыкі Еўрапейскага саюза ў дачыненні да беларускага грамадства. Беларускія ўлады цалкам перайгралі ЕС у інтэрпрэтацыі прычынаў увядзення санкцыяў супраць вышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў.

Адмена санкцыяў была ўспрынятая беларусамі як



прызнанне Еўрасаюзам сваёй паразы — такога меркавання трымаюцца 27,9 % апытаных, 18 % мяркуюць, што ЕС пайшоў на саступкі, бо хоча атрымаць доступ да беларускіх рынкаў. Пра ўвядзенне эканамічных санкцый супраць Беларусі не ведалі 60% апытаных, пра 12 патрабаванняў ЕС да Беларусі ў галіне дэмакратызацыі — 84,7% (амаль славутыя 83% «элегантнай перамогі»). Ды і санкцыі 56,4% рэспандэнтаў лічаць не вынікам таго, што ў нас парушаюцца правы чалавека, а караю Захаду за незалежную знешнюю палітыку Беларусі.

А вось адносіны да NATA — яскравы прыклад таго, як дзейнічаюць створаныя аднойчы стэрэатыпы. На пытанне «Ці пагражае нешта Беларусі?» 19 % рэспандэнтаў адказалі, што існуе ваенная пагроза. Калі задавалі пытанне, ці пагражае краіне NATA, то 50 з лішкам працэнтаў сказалі «так». «Маем такую карціну, — тлумачыць кіраўнікі BISS Віталь Сіліцкі. — Вам нешта пагражае? — Не. — А NATA? І тут у галаве ўключаецца нейкі маяк, што гэта кепска, хаця насамрэч мы не звязваем гэту структуру з сапраўднай ваеннай пагрозай нашай дзяржаве».

«Біпалярнасць» (Расія — Захад) геапалітычнай арыентацыі беларусаў з мінімальнай перавагай прыхільнікаў далучэння да ЕС па ранейшаму захоўваецца. Свой выбар рэспандэнты матывуюць двума асноўнымі фактарамі — сацыяльнай стабільнасцю (магчымасцю карыстацца дабротамі, якія адкрывае геапалітычны разварот) і ацэнкай балансу эканамічных даброт і стратаў у выніку рэалізацыі таго ці іншага геапалітычнага сцэнару. Разам з тым сацыёлагі прыйшлі да высновы, што ў плане сумяшчальнасці культуры беларускае грамадства больш гатовае прыняць еўрапейскія палітычныя каштоўнасці, чым культурныя.

Доступ да альтэрнатыўных крыніц інфармацыі пра Еўрапейскі саюз і магчымасць свабодна падарожнічаць па краінах ЕС падвышаюць праеўрапейскія настроі ва ўсіх без выключэння сацыяльных групах на 20–30 працэнтаў. Адначасова даследчыкі канстатуюць поўны правал спробаў «еўрапеізаваць» масавую свядомасць пры дапамозе знешніх электронных СМІ (радыёстанцый і тэлеканалаў, якія транслююць свае перадачы з-за мяжы). Ролю «еўрапеізатара» замацавалі за сабою інфармацыйныя інтэрнэт-рэсурсы.

Паспрабавалі сацыёлагі прааналізаваць і беларускі брэнд — талерантнасць. Прэзентуючы гэты блок, кіраўнікі BISS Віталь Сіліцкі падкрэсліў, што талерантнасць — гэта тое, што мы трываем, нават калі непрыемна, але не лічым узорам паводзінаў для сябе. Паводле яго слоў, выявілася, што беларусы значна больш цярпімыя, талерантныя ў пытаннях палітыкі, чым культуры. Напрыклад, наша грамадства пагаджаецца на цэнзуру ў СМІ (42% апытаных), абмежаванне дзейнасці палітычнай апазіцыі (32%), не лічыць патрэбным падвышаць ролю палітычных партый (29%). Адпаведна, сацыёлагі прыходзяць да высновы, што палітычныя трансфармацыі нацыя прыме лягчэй, чым культурныя.

ЭКАЛОГІЯ

# ДРУГОЕ ПРЫШЭСЦЕ

Вольга ХВОІН

**Беларусь вяртаецца да меліярацыі балот. Прынамсі на бліжэйшыя пяць гадоў гэты праект кіраўніцтвам дзяржавы акрэслены як прыярытэтны.**



Хутка гэтага балота не будзе

## Даведка:

Самыя старажытныя балоты Беларусі — палескія. Іх узрост — каля 11 тысяч гадоў. У Віцебскай вобласці балоты маладзейшыя — ім па 5–6 тысяч гадоў. Але там і дрыгва глыбейшая — да 9 метраў. На палескіх балотах таўшчыня пласта торфу часцей за ўсё не перавышае паўтара метра. Засвойваць балоты нашы продкі пачалі яшчэ ў XVIII стагоддзі, ствараючы выганы для жывёлы. Аднак сапраўдны націск беларускія балоты перажылі ў 1960-я гады, калі на пленуме ЦК КПСС 1964 года было прынята рашэнне пра шырокамаштабную меліярацыю. Але разам з тым у Беларусі з'явіліся пусткі і пясчаныя буры. Няправільнае выкарыстанне меліяраваных глебаў прывяло да іх спустошвання. Гаспадаркі з года ў год сеялі на тарфяніках бульбу, кукурузу, зерневыя і атрымлівалі добрыя ўраджаі. У выніку тарфяны пласт дэградаваў, і на месцы ўрадлівай зямлі з'явіліся пясчаныя прагаліны.



Смерч з попелу, дыму і пылу на адным з участкаў падпаленых тарфянікаў у Барысаўскім раёне



Работнікі МНС тушаць агонь на тарфяніках у Слуцкім раёне

## Харчовая незалежнасць?

«Я не бачу больш важнай праграмы, чым гэтая («меліярацыя» — рэд.) — заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас працоўнай паездкі ў Пінск на пачатку красавіка. — У наступнай пяцігодцы мы павінны ў асноўным завяршыць усе мерапрыемствы па праграме меліярацыі... Тут вы можаце даваць добрае збожжа. Мы павінны прывесці гэтыя землі ў ідэальны стан і атрымліваць ураджай не горш, чым у Краснадарскім краі». Ідэю вяртання праграм па меліярацыі падтрымліваюць у РУП «Інстытут меліярацыі» і мяркуюць, што «страта меліяраваных земляў для сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі можа азначаць не толькі паніжэнне валавога збору сельскагаспадарчай прадукцыі, пагаршэнне стану транспартных камунікацый, умоў працы і пражывання людзей, але ў выніку і пагрозу харчовай незалежнасці дзяржавы і ўзрастанне сацыяльнай напружанасці».

Апроч сельскай гаспадаркі на беларускія балоты маюць свае віды і энергетыкі. У межах выканання праграмы па забеспячэнню не менш за 25 працэнтаў аб'ёму вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі за кошт выкарыстання мясцовых відаў паліва і альтэрнатыўных крыніц энергіі штогод нарошчваюцца аб'ёмы здабычы торфу.

У 2008 годзе Савет міністраў зацвердзіў адмысловую праграму «Торф». Паводле яе, да 2020 года здабычу торфу ў Беларусі плануецца павялічыць у два разы — да 4,3–4,4 мільёна тон, адвесці пад распрацоўку 1 100 гектараў балот і пабудаваць 770 гектараў палёў для здабычы торфу. Здабыты торф будзе выкарыстоўвацца не толькі як паліва, але і ў сельскай гаспадарцы краіны для вытворчасці ўгнаенняў. Па ацэнках навукоўцаў НАН Беларусі, наша краіна валодае запасамі торфу ў аб'ёме каля 4 мільярдаў тон, а геалагічныя запасы торфу, змешчанага ў радовішчах адмыслова ахоўваемых прыродных тэрыторый і земляў, не занятых сельскагаспадарчай вытворчасцю, складаюць 1,2 мільярда тон.

## Сады ці пустэльні?

У прыхільнікаў ідэі асушыць беларускія балоты ёсць свае апаненты. Так, вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Казулін трымаецца думкі, што меліярацыя стварае пагрозу для ўстойлівага існавання балотных абшараў і не мае пад сабой эканамічнага абгрунтавання. А асушэнне цягам бліжэйшых гадоў да 50 тысяч гектараў балот прывядзе да звароту эфекту «пустэльні».

У Беларусі цяпер рэалізуюцца праекты па рэнатуралізацыі і паўторнаму забалочванню тэрыторый. Напрыканцы мінулага года былі завершаныя працы на выпрацаваных тарфяных радовішчах «Асінаўскае–1, 2» у Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці. Гэтыя тэрыторыі — частка былога верхавога балота. Яны з'яўляюцца адзінаццатай і дванаццатай тэрыторыямі, паўторна забалочанымі ў рамках праекту ПРААН/ГЭФ ад 2007 года. Пасля паўторнага забалочвання паступова аднаўляецца ландшафт, унутраныя працэсы балота, з'яўляецца тыповая расліннасць.

Да слова, на Асінаўскіх радовішчах селіцца група рэдкіх відаў птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, — вялікі бугай, вялікі падорлік, скопы, шэры журавель, чорны бусел ды іншыя. Аднак мерапрыемствы па паўторнаму забалочванню дастаткова працаёмкія і стратныя. Каб падвысіць і стабілізаваць узровень вады на названых радовішчах, было пабудавана некалькі дзесяткаў водарэгулюючых будынкаў, створаная адмысловая сістэма.

Аднаўленчыя працы завяршаюцца і на адным з буйнейшых у Еўропе верхавых балот — Ельня плошчай звыш 200 квадратных кіламетраў. Праект «Аднаўленне гідралагічнага рэжыму цэнтральнай часткі балота Ельня» таксама фінансуецца Праграмай малых грантаў ГЭФ у Рэспубліцы Беларусь і рэалізуецца арганізацыяй «Ахова птушак бацькаўшчыны» ў супрацоўніцтве з адміністрацыяй заказніка «Ельня».

Актыўная меліярацыя, пракладка шматлікіх каналаў і змены рэчышчаў рэк прывялі да істотнага паніжэння ўзроўню грунтавых водаў, што стала адной з асноўных прычын і буйных пажараў на балоце. У выніку апошняга пажару ў 2002 годзе выгарала больш за 70 працэнтаў балота. Пажары і нізкі ўзровень грунтавых водаў прывялі да дэградацыі экасістэм, эканамічная шкода ад страты толькі знішчаных пажарам журавіннікаў складае звыш 100 мільёнаў рублёў у год.

Праект Праграмы развіцця ААН і ГЭФ па аднаўленні парушаных тарфянікаў рэалізуецца ў Беларусі са жніўня 2006 года па жнівень 2010-га. За гэты час будуць адноўлены 17 парушаных балот ва ўсіх абласцях Беларусі. На выкананне прац вылучаецца 1 мільён 50 тысяч долараў.

## Балота на мільён

Эколагі, якія займаюцца пытаннямі забалочвання тэрыторый, сцвярджаюць, што балоты здольныя прыносіць эканамічную карысць у сваім натуральным стане. Напрыклад, разлік эканамічных выгодаў буйнага нізіннага балота Званец, размешчанага на тэрыторыі Драгічынскага і Кобрынскага раёнаў Брэсцкай вобласці, паказаў, што экалагічныя паслугі заказніка штогод складаюць больш за 1 мільён долараў ЗША. У разлік бярэцца жывёльны і раслінны свет балота, ачышчэнне паветра і вады экасістэмай.

Асушаныя балоты становяцца крыніцамі выкідаў парніковых газаў. А жывыя балоты наадварот з'яўляюцца своеасаблівым фільтрам. Адмерлая біямаса не раскладаецца цалкам, і прыкладна адна дзесятая яе частка адкладаецца ў выглядзе торфу. Частка вугляроду, якую расліны атрымалі ў выглядзе вуглякіслага газу, застаецца ў балоце назаўжды. Так выглядае працэс «канфіскацыі» вуглякіслага газу з атмасферы. У асушаных балотах торф не назапашваецца, і назіраецца працэс інтэнсіўнага вылучэння вуглякіслага газу ў навакольнае асяроддзе.

Парніковыя газы і глабальныя змены клімату — тэмы сусветных экалагічных самітаў і мясцовых «круглых сталоў». Беларусь узяла на сябе абавязальніцтвы па змяншэнню выкідаў парніковых газаў да 2020 года не больш за 15 працэнтаў ад узроўню 1990 года. У Міністэрстве прыроды і аховы навакольнага асяроддзя падлічылі, што, каб прадухіліць глабальныя змены клімату да 2020 года, выкіды парніковых газаў у Беларусі павінны быць скарочаныя на 15–30 працэнтаў.

Эксперты грамадскага аб'яднання «Зялёная сетка» лічаць, што Беларусь можа скараціць выкіды парніковых газаў на 30–35 працэнтаў да 2020 года і на 40 працэнтаў да 2050 года. Аднак у Мінпрыродзе трымаюцца думкі, што доля выкідаў Беларусі ў сусветным маштабе малая, таму краіна найперш кіруецца не экалагічнымі фактарамі, а планамі ўласнага развіцця. Значыць, будуць уведзеныя новыя крыніцы энергіі, прамысловыя прадпрыемствы, асушаюцца балоты. Атрымліваецца, што з аднаго боку Беларусь бярэ абавязальніцтвы зменшыць выкіды парніковых газаў, а з іншага — іх павялічвае.

Шэраг экалагічных арганізацый з такім падыходам не згодныя. Напрыклад, экалагічнае таварыства «Зялёная сетка» прапануе для больш адэкватнай ацэнкі выкідаў парніковых газаў і правядзення адпаведных праектаў па зніжэнню выкідаў уключыць у патрабаванні для сектара землекарыстання, змены землекарыстання і лясной гаспадаркі (LULUCF) эмісіі і сцёкі ад дэградаваных балот, іх аднаўленне і абарону.

«Цяпер Кіёцкімі механізмамі фактычна ахопленыя толькі лясы і земельныя ўгоддзі, прычым нават там падлік рэальнага скарачэння выкідаў вядзецца не зусім адпаведна. Мы выступаем за тое, каб і балоты ўлічваліся ў LULUCF, тады могуць з'явіцца магчымасці аднавіць прыроду рэспублікі і паступова зніжаць эмісію парніковых газаў», — зазначае эксперт экалагічнага таварыства «Зялёная сетка» Анастасія Галяк.

Прадстаўніца гэтай жа арганізацыі Наталля Парчына лічыць — праблема ў тым, што міністэрствы паміж сабою не супрацоўнічаюць, калі ствараюцца праграмы, у выніку атрымліваем супярэчнасці.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 19 МАЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Вострасюжэтны дэтэктыў «Права на памілаванне» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**09.55** Спартовая драма «Гол у Спаскія вароты» (СССР).
**11.25** Відэафільм АТН «Паўночны гарадок» цыклу «Зямля беларуская».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Свой-чужы» (Расія).
**14.05** Здароўе.
**14.30** Культурныя людзі.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Альманах вандраванняў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Запасны інстынкт» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Вострасюжэтны дэтэктыў «Права на памілаванне» (Расія-Украіна). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША).
**23.00** Крымінальны трылер «Небяспечны Бангкок» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Праўда хавае хлусню». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Праўда хавае хлусню». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водблiскi». Серыял. Закл. серыя.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Асабістая справа капітана Руміна» Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Бугімэн 2». ЗША, 2007 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Вялікае княства Літоўскае».
**11.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.00** Спорт-кадр.
**12.35** Камедыйная меладрама «Венера і Апалон» (Францыя).
**13.25** «Прыгоды Бураціна». Анімацыйны фільм (СССР).
**14.30** «Лабірынты: драўляныя храмы Прыкарпацця». Фільм першы.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.25** Серыял «Дзень гневу». 2-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.50** Калыханка.
**21.10** Драма «Жыццё пасля яго» (Францыя).
**22.55** Хакей. Формула гульні.
**23.25** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. БГК ім.Мяшкова-Дынама (Мінск).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Драма Івана Броўкіна». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Ліквідацыя». Расія.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя». Расія, 2007 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Сем смяротных грахоў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Дачны адказ».
**11.50** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вярнуць на даследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Дэсант ёсць дэсант».
**21.35** Серыял «Час Волкава».
**23.50** «Позняя гутарка».
**00.30** «Першая кроў».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Манака. Агляд.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 10.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA (Польшча). Дзень 2.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA (Польшча). Дзень 3.
**15.40** Веласпорт. «Планета Армстронг».
**15.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 11.
**18.30** Футбол. Моладзевы фэст да 23 гадоў. Групавы этап. Чылі - Катар. Тулон (Францыя).
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.25** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.40** Футбол. Моладзевы фэст да 23 гадоў. Групавы этап. Данія - Расія. Тулон (Францыя).
**22.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**23.00** Абранае па серадах.
**23.05** Конны спорт. Кубак нацый. Ла Боль (Францыя).
**00.05** Навіны коннага спорту.
**00.10** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Мальёркі. Іспанія.
**00.40** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Германіі. Германія.
**00.50** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.55** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.00** Веласпорт. «Планета Армстронг».
**01.05** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Каліфорніі. ЗША. Этап 4.
**02.00** Вось дык так!!!
**02.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.25** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 5 серыя, «Расія».
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** На колах.
**20.05** «ГМА. Прагрэс ці катастрофа?», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**20.35** Хто ёсць кім?: Сяржук Вітушка.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз клапоціцца пра слабых».
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**23.40** Аб'ектыў.

## 20 МАЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.05, 19.30, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.35, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.40** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Вострасюжэтны дэтэктыў «Права на памілаванне» (Расія-Украіна). 2-я серыя.
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Дэтэктыў «Сусед» (Расія).
**13.45** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.50** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Запасны інстынкт» (Расія). 3-я серыя.
**16.40** Сфера інтэрасаў.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя. У перапынку: «Зона Х». Крымінальная хроніка».
**19.55** «КЕНО».
**20.00** Вострасюжэтны дэтэктыў «Права на памілаванне» (Расія-Украіна). 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША).
**23.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**00.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**00.15** Дзень спорту.
**00.25** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Праўда хавае хлусню». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Праўда хавае хлусню». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Асабістая справа капітана Руміна». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Асабістая справа капітана Руміна». Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Пажар на тэлевежы». Германія, 2007 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Эпоха вялікіх князёў» (Беларусь).
**11.15** Экспедыцыя.
**11.45** Бітва экстрасэнсаў.
**12.50** Хакей. Формула гульні.
**13.20** Камедыйная меладрама «Венера і Апалон» (Францыя).
**14.15** Мультфільм.
**14.30** Жывы гук.
**15.10** Вострасюжэтны серыял «Дзень гневу» (Расія). 3-я серыя.
**16.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.10** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**17.45** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.45** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.
**20.50** Калыханка.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.30** Час футболу.
**00.00** Культсвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Усміхайцеся, спадары, усміхайцеся! Алег Янкоўскі». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Ліквідацыя». Расія, 2007 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя». Расія, 2007 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Трэцяе вока. Загадкі зроку». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Праект «У пошуках Францыі».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Вочная стаўка».
**11.45** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на даследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Дэсант ёсць дэсант».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** Прэм'ера. «Пераможца пераможцаў».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Кубак нацый. Ла Боль (Францыя).
**10.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA. Варшава (Польшча). Дзень 3.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Варшава (Польшча). 1/4 фіналу.
**15.40** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**15.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 12.
**18.30** Футбол. Моладзевы фэст да 23 гадоў. Групавы этап. Калумбія - Кот-д'Івуар. Тулон (Францыя).
**20.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.40** Футбол. Турнір УЕФА да 18 гадоў (Champions Challenge). Мадрыд (Іспанія).
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. Мадрыд (Іспанія). Фінал.
**23.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 12.
**23.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Каліфорніі. ЗША. Этап 5.
**02.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Бясконцая гісторыя», маст. фільм, 1984 г., ЗША–Германія.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** МакраФон: «Рок-карона: 1994–1996» Архіўныя запісы.
**20.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Форум (ток-шоў): «Што мы ямо?»
**22.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**22.50** Рэпартэр.
**23.15** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 23 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

### Першы канал (1)

**07.20** Дзіцячы фільм «Новая старая казка» (Расія).
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Святой Троіцы.
**09.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** «У свеце матораў».
**11.25** «Nota Bene».
**12.00** Навіны.
**12.10** Трагікамедыя «Сабачае сэрца» (СССР). 2-я серыя.
**13.30** «ПАР-2010. У плэй-офф збіраюцца ўсё».
**14.00** Хранікальна-дакументальны фільм «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.25** «Я чуў, як зямля стагла…». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Беларуская песня ў Сібіры».
**15.55** Камедыя «Мянялы» (Расія).
**17.40** OFF STAGE LIFE.
**18.00** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** Відэафільм АТН « Паўночны гарадок» цыклу «Зямля беларуская».
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.55** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.45** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2008 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** «Песні Перамогі».
**14.30** «Градка».
**15.05** Севастопальскія аповяды. «Чырвоныя на Чорным».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Адэса».
**17.15** Рамантычная камедыя «М+Ж».
**18.55** Прэм’ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Здабытак Рэспублікі».
**23.50** Меладрама «Элегія».

### СТВ

**07.05** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільме «Школа нягоднікаў». ЗША, 2006 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** Фільм «12 крэслаў». СССР, 1977 г. 2-3-я серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Фрыда». ЗША - Канада - Мексіка, 2002 г.
**23.00** «Прафесійны бокс».
**23.55** Фільм «Кус-кус і барабулька». Францыя, 2007 г.
**02.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.10** Дабравест.
**07.35** Мір вашай хаце.
**07.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.10** Фантастычны баявік «Вавілон нашай эры» (Францыя-ЗША-Вялікабрытанія).
**09.55** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.50** Кінаспробы.
**12.10** Бухта капітанаў.
**12.50** «Правы чалавека».
**13.05** Гаспадар.
**13.35** Вострасюжэтны дэтэктыў «Супрацьстаянне» (Расія). 4-я і 5-я, закл., серыі.
**16.15** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч за 3-е месца. Прамая трансляцыя.
**19.30** Нашы тэсты.
**20.05** Экспедыцыя.
**20.40** Тэлебарометр.
**21.00** Смешная часіна.
**21.35** Фільм-мюзікл «Аднойчы» (Ірландыя).
**23.20** Свая музыка. Працяг.
**23.50** Пасоўванне+.
**00.05** Футбол. Кубак Беларусі. Фінал.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.55** Фільм «Пачаць спачатку. Марта». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Святло ў канцы тунэлю».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** Прэм’ера. «Храм для Анегіна. Пасля славы». Дакументальны фільм.
**16.10** Камедыя «Вуліца поўная нечаканасцей».
**17.30** Прэм’ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.35** «Святочнае шоў Валянціна Юдашкіна».
**23.05** Фільм «Грахі нашы». Расія, 2008 г.
**00.40** Канцэрт-сустрэча з музычным калектывам Пятра Наліча.

### НТВ

**06.05** Прыгодніцкі фільм «Джэк Хантэр: праклён магільні Эхнатона».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм’ера. Праект «У пошуках Францыі».
**14.10** Прыгодніцкі фільм «Джэк Хантэр: праклён магільні Эхнатона».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Масквічы». Тэлевізійная камедыя.
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Шэрыф».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Кваліфікацыя. Монца (Італія).
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Warm-up. Монца (Італія).
**10.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 14.
**12.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 1.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Монца (Італія). 3-і этап. Гонка 1.
**14.45** Аўтаспорт. Формула - 2. Монца (Італія). Гонка 2.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Монца (Італія). 3-і этап. Гонка 2.
**16.40** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 15.
**18.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 1.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**22.00** Футбол. Моладзевы фэст да 23 гадоў. Групавы этап. Данія - Чылі. Тулон (Францыя).
**23.00** Мотаспартыўны часопіс.
**23.15** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**23.45** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA.
**00.30** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.35** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Каліфорніі. ЗША. Этап 8.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Восем месцаў. Вандроўка ў Афганістан», дак. фільм, 2006 г., ЗША.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Верная», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**20.05** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): 16 серыя.
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Апошні імператар», маст. фільм, 1987 г., Вялікабрытанія–Кітай–Гон-Конг.

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 фил. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________

Всего ________

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

МЕРКАВАННЕ

# ІМЕМ ФУТБОЛА

**У рамках падрыхтоўкі да «Еўра–2012» ва Украіне можа адбыцца маштабная палітычная зачыстка. Такую выснову зрабілі ўдзельнікі канферэнцыі «Украінскае грамадства і «Еўра–2012», якая адбылася ў Кіеве ў пачатку мая. Якія падставы для такога кшталту прагнозаў? Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з адным з арганізатараў канферэнцыі, кіеўскім праваабаронцам Міхаілам Буткевічам.**






— ***Якую ролю адыгрывае тэма чэмпіянату Еўропы па футболу ў грамадскай дыскусіі?***

— Месца футболу і будучага турніру ў грамадстве цяжка пераацаніць. Дастаткова ўключыць тэлевізар. Практычна ўсе вядучыя рынкавыя брэнды паступова запускаюць спецыяльныя рэкламныя кампаніі, пабудаваныя на тэме футболу. Адзін прыклад: тое, што пратэсты супраць працягу арэнды расіянамі базы ў Крыме мелі дастаткова абмежаваны маштаб, таксама звязана са спортам. Пачатак шырокіх пратэстаў супраць дамовы Януковіча — Мядзведзева значыў бы зрыў чэмпіянату, а гэтага Цімашэнка ніхто нават на Заходняй Украіне не прабачыць. Таму апазіцыя вымушаная абмежавацца эпізадычнымі вылазкамі. І такая сітуацыя, на думку большасці экспертаў, пратрымаецца аж да правядзення чэмпіянату. Ідэальныя ўмовы для закручвання гаек.

— ***Што змянілася ў мадэлі падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы па футболу пасля прыходу Партыі рэгіёнаў да ўлады?***

— Па вялікаму рахунку, з-за таго, што прэзідэнцкія выбары павінны былі адбыцца ўзімку 2009 года, ва ўрадзе Цімашэнка наконт чэмпіянату ніхто асабліва не напружваўся. Цяпер зразумела, што турнір пройдзе падчас кадэнцыі Януковіча, і апошні, у выпадку правалу спаборніцтва, будзе несці персанальную адказнасць. Такі сцэнар ставіць крыж на шансах Януковіча атрымаць другі мандат на прэзідэнцкіх выбарах 2015 года. Таму Партыя рэгіёнаў падышла да справы вельмі сур'ёзна. Прэм'ер-міністр абавязаны кожны панядзелак даваць прэзідэнту справаздачу наконт ходу падрыхтоўкі. Адзін з віцэ-міністраў кабінета Азарава персанальна адказвае за падрыхтоўку да турніру. Фактычна гэта такое міністэрства футболу. Прычым той футбольны віцэ-прэм'ер — Барыс Калеснікаў — трэцяя або чацвёртая асоба ў партыі. У выпадку, калі ўсё пройдзе добра, яму ўжо пабяцалі (прынамсі, так кажуць блізкія да Януковіча крыніцы) пасаду прэм'ера. Для параўнання, у Польшчы, якая будзе таксама прымаць спаборніцтвы, усю падрыхтоўку цягне адзін з дэпартаментаў Міністэрства спорту.

— ***Вы ўжо згадалі, што «Еўра–2012» — цудоўны падстава для рэпрэсій. Ці ёсць ужо адзнакі таго, што рыхтуецца зачыстка палітычнага поля?***

— Дастаткова згадаць, што Калеснікаў вядомы не толькі як добры менеджэр, аднак як адыёзная фігура, лідэр самай прарасійскай групы ўнутры Партыі рэгіёнаў. Менавіта ён арганізаваў сумна вядомы з'езд у Севераданецку, на якім была агучана ідэя стварэння аўтаноміі Усходу Украіны. Пра намеры ўладаў таксама гаворыць некаторыя перастаноўкі ўнутры сілавых ведамстваў. Так, новым міністрам унутраных спраў стаў Анатоль Магілёў — асоба, якая звязана з сумна вядомымі падзеямі ў Крыму ў мінулым годзе. Будучы галоўным міліцыянерам аўтаноміі, ён надзвычайна рэагаваў на спробы нелегальных захопаў зямель. Такія захопы робяць крымскія татары, якія лічаць гэту зямлю кампенсацыяй за дэпартацыю 1944 года. Звычайна ўсё абмяжоўвалася доўгім супрацьстаяннем. У нашым выпадку супраць захопнікаў былі ўжытыя газы, БМП і спецназ. Апынуўшыся на пасадзе дырэктара МУС, Магілёў правёў рэарганізацыю так званых грамадскіх камітэтаў (назіральнікі ад грамадскіх арганізацый пры структурах МУС). Усе старыя камітэты абвясцілі нядзейнымі. І на месцах сфармаваныя новыя, лаяльныя да міністра.




— ***Хто можа стаць ахвярай зачысткі?***

— Зачыстка будзе, безумоўна, апраўданая неабходнасцю бяспекі падчас турніру. Ужо зараз гавораць пра неабходнасць паўтарыць нешта накшталт таго, што было ў Маскве падчас Алімпіяды 1980-га. Дакладней, прапануюць зачыніць гарады, дзе будуць праходзіць матчы, каб не дапусціць прытоку крымінальных элементаў і, натуральна, палітычных экстрэмістаў. І гэта самае складанае пытанне. Справа ў тым, што ў УЕФА існуе ліст крытэрыяў правых экстрэмісцкіх арганізацый, і туды можна лёгка падагнаць амаль усе моладзевыя апазіцыйныя і патрыятычныя арганізацыі. Усе яны, як правіла, пазітыўна ставяцца да асобаў кшталту Сцяпана Бандэры і выкарыстоўваюць сімволіку ўкраінскіх нацыяналістаў часоў другой сусветнай вайны. Сам факт, што гэта сімволіка нагадвае фашысцкую, а бандэраўцы мелі кантакты з гітлераўцамі, дазваляе нашым уладам лёгка паставіць на іх кляймо «правы экстрэміст» і апраўдаць ціск на нацыяналістычную моладзь у вачах Еўропы. Хаця сітуацыя, натуральна, больш складаная. Бандэра — гэта частка калектыўнай ідэнтыфікацыі заходніх украінцаў. Яны не ўкладваюць у асобу Бандэры агрэсіўныя расісцкія ідэі. Чэмпіянат — добрая падстава, каб зачысціць увесь сектар апазіцыйных грамадзянскіх актывістаў як на левым, так і на правым флангу. Асабліва тых, хто перашкаджае якім-небудзь бізнес-праектам. Ніхто асабліва разбірацца не будзе, калі народ патрабуе аднаго — вялікага футбола.

**Тое, што пратэсты супраць працягу арэнды расіянамі базы ў Крыме мелі дастаткова абмежаваны маштаб, таксама звязана са спортам**

— ***Дапусцім, вы маеце рацыю. Як можа рэагаваць апазіцыя на такія крокі ўладаў?***

— Мы спрабуем усталяваць кантакты з УЕФА. Фактычна на час турніру Плаціні будзе сябрам кабінета міністраў і можа паўплываць на стан рэчаў. Катастрофа, калі самае буйное спартовае мерапрыемства ў гісторыі Украіны стане пачаткам палітычнай рэакцыі! Праўда, шмат тут залежыць ад саміх апазіцыянераў, якім трэба знайсці іншых аўтарытэтаў акрамя супярэчлівых гістарычных персанажаў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Чуткі наконт магчымага ўмяшання ў беларускі палітычны працэс прыкметна ажывілі ход выбарчай кампаніі. Да падзей у Кіргізіі прызначаныя на пачатак наступнага года выбары разглядалі як нешта фармальнае, ад сілы здольнае паўплываць на расстаноўку акцёраў у апазіцыйным лагеры. Мясцовыя выбары, якія разглядалі як рэпетыцыю прэзідэнцкіх, пацвердзілі старыя прагнозы. Практычна ўсюды перамогу намалявалі кандыдатам ад улады. Але зараз у паветры запахла зменамі, і насуперак правілам дэмакратычная супольнасць пачала дэманстраваць прыкметы жыцця.

**«Евразийский дом» (Расія)**

Гэта (новыя пошліны на імпарт расійскай нафты) істотна паменшыла канкурэнтаздольнасць беларускіх нафтапрадуктаў. Таму Аляксандр Лукашэнка вырашыў шукаць альтэрнатыўныя крыніцы паставак нафтавай сыравіны. У гэтым сэнсе Венесуэла, дзе кошты на чорнае золата залежаць не ад сусветных каціровак, а ад добразычлівасці прэзідэнта, ідэальна падыходзіць Беларусі. Хутчэй за ўсё, менавіта дзякуючы сяброўству Аляксандра Лукашэнкі з Уга Чавесам намеснік міністра эканомікі Беларусі Анатоль Філонаў дазволіў сабе яшчэ да пачатку пробнай пастаўкі венесуэльскай сыравіны заявіць, што «ўмовы лагістыкі дазваляюць забяспечыць рэнтабельнасць перапрацоўкі гэтай нафты».

**«Деловая столица» (Украіна)**

Эканамічнай логікі ў гэтым праекце (пастаўкі венесуэльскай нафты ў Беларусь праз Украіну) няма. Таму мэтазгоднасць кроку Януковіча насустрач прэзідэнту Лукашэнку не зразумелая да канца. Не вядома, якая эканамічная логіка ў гэтых дамоўленасцях? Але калі партнёр, які набіваецца ў сябры, просіць, чаму б не пайсці на абсурдную з эканамічнага пункта гледжання справу? Хіба гэта так ужо непрыстойна? Я думаю, гэты праект усё адно не выжыве ў працяглай перспектыве. Гэта толькі эпізод. Гэта ж вар'яцкая аперацыя. Папрасту каб насаліць вам, масквічам.

**«Эксперт» (Украіна)**

Віна Расіі ў тым, што яна, у адрозненне ад той жа Польшчы, кінула «беларускае пытанне» на самацёк, падтрымлівала не тых грамадзян рэспублікі, якія выступалі за саюз з Расіяй, а падтрымлівала персанальна Лукашэнку, рабіла стаўку не на сістэму адносін, а на асобу. А гэта розныя рэчы. Доказ — страта Грузіі і Малдавіі, цяперашняя стаўка Беларусі на Захад у знешняй палітыцы, праславутае «Усходняе партнёрства». Віна РФ і ў тым, што пад «беларускай апазіцыяй» разумеецца толькі «купка людзей», якая фінансуецца Захадам. Прарасійскай палітычнай сілы, хоць яе падтрымаюць 80 працэнтаў беларускіх грамадзян, у Беларусі няма, не кажучы ўжо пра прарасійскую апазіцыю, якая не здольная з'явіцца як з-за прэсінгу адміністрацыйнага рэсурсу, так і з боку празаходніх нацыяналістаў. Няма ніякіх сумневаў: такое развіццё падзей лагічна прывядзе да таго, што Расія атрымае ў Беларусі другую Латвію, Грузію, Украіну.

**«Regnum» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КУБА. ЭКАНАМІЧНЫ САБАТАЖ

Куба наладзіла цікавы бартэр з Венесуэлай. Гавана атрымлівае ад Каракаса нафту і расплачваецца за гэта сваімі настаўнікамі і дактарамі, якія працуюць у венесуэльскіх шпіталях і школах. Колькасць кубінцаў, якія працуюць у розных сацыяльных адукацыйных і медычных праграмах Уга Чавеса, ідзе на дзесяткі тысяч. Дарэчы, часткова менавіта дзякуючы гэтым праграмам за Чавеса галасуюць. Аднак аказалася, што не ўсё так добра ў гэтай схеме. Кубінцы выкарыстоўваюць Венесуэлу як плацдарм для таго, каб збегчы ў ЗША або хаця б у суседнюю Калумбію, дзе назіраецца дэфіцыт «людзей у белых халатах». Як сцвярджае калумбійская газета «El Tiempo», за сем гадоў кубінскай медычнай місіі ў Венесуэле як мінімум 2000 дактароў збеглі адтуль у іншыя краіны. Па словах аднаго з уцекачоў, які даў інтэрв'ю «El Tiempo», збегчы не так проста. У складзе кубінскага персаналу ёсць людзі з адмысловых органаў, у абавязак якіх уваходзіць кантроль за суайчыннікамі. Напрыклад, пасля працы ўсе кубінцы павінны быць дома і не пакідаць памяшканне да наступнага працоўнага дня. Але вырвацца з-пад апекі агентаў спецслужбаў недастаткова, трэба яшчэ неяк дабрацца да мяжы з Калумбіяй, каб не злавілі паліцэйскія або г.зв. баліварская міліцыя — ваенізаваныя структуры прыхільнікаў Чавеса. Апошні этап — хабар памежнікам, які дазваляе перайсці кардон. Тым не менш, гэта таго варта: у Венесуэле кубінскія дактары зарабляюць 20 долараў штомесяц, у Калумбіі — у 10 разоў больш. Застаецца дадаць, што супраць усіх, хто здрадзіў Кастра на радзіме, заводзяць справу па артыкулу «эканамічны сабатаж».

**Па матэрыялах «El Tiempo» (Калумбія)**

### ІСПАНІЯ. БАСКСКІ ЧАРНОБЫЛЬ

Баскскім Чарнобылем называюць зараз бамбардзіроўку 25 красавіка 1937 года нямецкімі лётчыкамі (саюзнікамі Франка) горада Герніка, што недалёка ад Сан-Себасцьяна. У выніку быў знішчаны і славуты дуб — сімвал аўтаноміі краю. Кожны новы кароль Іспаніі быў абавязаны стаць пад тым дубам і гарантаваць аўтаномныя правы рэгіёну. Кожны год баскі ўзгадваюць трагедыю Гернікі. На гэты раз святкаванні не абышліся без правакацый. Адзін з удзельнікаў той бамбардзіроўкі, былы нямецкі лётчык, 83-гадовы Манфрэд Рэдэр вырашыў арганізаваць 26 красавіка публічную лекцыю ў суседнім Сан-Себасцьяне. Лекцыя, якую зладзілі прыхільнікі Франка, называлася «Вызваляючы Еўропу». Ідэя адразу не спадабалася баскскім нацыяналістам, якія звярнуліся ў адпаведныя дзяржаўныя структуры. Аднак іспанскі МУС заявіў, што не можа забараніць Рэдэру выступаць. У прынцыпе, з-за пратэстаў лекцыя прайшла ў вельмі абмежаваным фармаце, аднак баскі і іспанскія левыя пабачылі ў ёй новы віток спрэчак вакол спадчыны Франка. Зараз уся Іспанія падзеленая на тых, хто заклікае праз судовы працэс прызнаць Франка і яго прыхільнікаў злачынцамі. І тых, хто прапануе не чапаць нябожчыка. Дарэчы, да іх належыць і кароль Хуан Карлас, які на мінулым тыдні прыняў удзел у пахаванні былога старшыні Міжнароднага алімпійскага камітэту Хуана Карласа Самаранча. Самаранч у час дыктатуры Франка займаў высокую пасаду ў дзяржаўным апараце, за што яго да самай смерці крытыкавалі іспанскія левыя.

**Па матэрыялах «Gara» (Іспанія)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ЯК ГЭТА БЫЛО Ў АПОШНІ РАЗ



У выніку выбараў брытанцы атрымалі так званы «падвешаны» парламент — парламент, дзе ніводная партыя не мае абсалютнай большасці і вымушана шукаць падтрымкі ў дэпутатаў ад іншых партый. У гісторыі брытанскага парламентарызму такія выпадкі бывалі не часта — апошні раз у 1974 годзе. Тады ў выніку выбараў лейбарысты не здолелі набраць патрэбную дэпутацкую большасць. У іх быў 301 мандат, у торы — 297, а ў ліberalаў — 14. Ініцыятыву перахапілі кансерватары, якія на той момант яшчэ фармавалі ўрад. Прэм'ер Эдвард Хез выклікаў на перамовы лідэра лібералаў Джэрымі Торпа. У час перамоваў той патрабаваў у якасці ўзнагароды за ўваход у кааліцыю правядзенне выбарчай рэформы — выбараў па партыйных спісах. Кансерватары адмовіліся, і ў выніку лейбарысты сфармавалі кабінет меншасці. Аднак з-за нестабільнасці (панаваў эканамічны крызіс), ён пратрымаўся толькі да кастрычніка, калі лейбарысты абвясцілі новыя выбары і перамаглі на іх, атрымаўшы нарэшце патрэбную большасць. Праўда, гэта мала што дало. Спробы выйсці з крызісу за кошт сацыялістычных метадаў не мелі поспеху, і тым самым праклалі дарогу ва ўладу Маргарэт Тэтчэр у 1979 годзе. Вось і зараз кансерватары зноў атрымалі права сфармаваць кабінет у саюзе з лібераламі.

**Па матэрыялах брытанскай прэсы**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЛІДЭР НАЦЫІ або БІЧ БОЖЫ

**На пасяджэнні казахскага парламента група дэпутатаў унесла на разгляд законапраект пра наданне Назарбаеву статуса «лідэр нацыі». Пра казахскі аўтарытарызм журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з праваабаронцам з Алма-Аты Андрэем Грышыным.**



Рэжым робіць выснову з кіргізскіх падзей, аднак яны абсалютна супярэчаць здароваму сэнсу. Папросту дамінуюць страх і інстынкт самазахавання. Аднак нельга выключаць, што «лідэр нацыі» спатрэбіўся для канстытуцыйнай рэформы

***— Што канкрэтна прапанавалі дэпутаты?***

— Працытую заяву аднаго з аўтараў законапраекту: «Прапанаваныя папраўкі прадугледжваюць дадатковыя гарантыі недатыкальнасці першага прэзідэнта РК, яго маёмасці, яго сямейнікаў». Паводле прапанаваных паправак, Назарбаеў не можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за ўчынкі, зробленыя ім у перыяд ажыццяўлення паўнамоцтваў першага прэзідэнта Рэспублікі Казахстан. Пры гэтым, па словах ініцыятараў, новае заканадаўства не надае Назарбаеву статус пажыццёвага прэзідэнта.

***— Такім чынам, новага спецыяльнага закона пра «лідэра нацыі» не будзе?***

— Як кажуць у парламенце, дастаткова шэрагу паправак у прынятым ў 2001 годзе Закон аб першым прэзідэнце Казахстана. І ў гэтым праяўляецца першая супярэчнасць ідэі. Той закон фактычна гарантуе Назарбаеву пажыццёвае праўленне, даючы яму права абірацца бясконцую колькасць разоў. Акрамя таго, першы прэзідэнт, паводле закону, можа быць асуджаны выключна за здраду радзіме. Нашто патрэбна яшчэ нейкі закон? Нелагічныя і спасылкі на міжнародную практыку. Дэпутаты ахвотна прыводзяць у прыклад Джэральда Форда, які спецыяльным указам прыпыніў крымінальнае следства супраць свайго папярэдніка Рычарда Ніксана, што папаўся на скандале «Уотэргейт». Аднак нават не дасведчаны ў амерыканскім праве чалавек не разумее такіх аргументаў: рашэнне пра недатыкальнасць Ніксана прымаў не ён сам, а новы прэзідэнт. Было б лагічна, каб Назарбаеў атрымаў такой статус ад наступнага прэзідэнта.

***— Ці магла такая заканадаўчая ініцыятыва з'явіцца без санкцыі Назарбаева?***

— Увогуле, казахскі парламентарызм — цікавая рэч. У парламенце засядаюць выключна прадстаўнікі прэзідэнцкай партыі, мала вядомыя выбаршчыкам. Каб неяк засведчыць сваё дэпутацтва, яны перыядычна прапаноўваюць дзіўныя законапраекты. Аднак рабіць піяр на імені прэзідэнта вельмі небяспечна. Нават калі спісаць усё на тое, што нейкая група вырашыла праявіць сябе напярэдадні 70-годдзя Назарбаева, да якога рыхтуецца ўся краіна. Ініцыятыва атрымала ўхваленне на самім версе. Пра гэта кажа рэакцыя дзяржаўнай прэсы. Вось што піша адна з афіцыйных газет: «Бясспрэчна тое, што Нурсултан Абішавіч Назарбаеў з'яўляецца агульнанацыянальным лідэрам, таму ініцыятыва шэрагу дэпутатаў па прыняцці законапраекта пра «лідэра нацыі» правільная і зразумелая. Гэта шчырае імкненне пазначыць сапраўды гістарычную ролю першага прэзідэнта».

***— Якая рэакцыя на гэта грамадства і апазіцыі?***

— Апазіцыя знайшла ў сабе мужнасць выступіць з рэзкай крытыкай ініцыятывы. Так, сацыял-дэмакраты назвалі прапанову дэпутатаў «звычайным падхалімствам». Указваецца, што ў законе папросту няма такога тэрміну, як «лідэр нацыі», не прапісаны ягоныя функцыі. Адпаведна, трэба прымаць новы закон. Што да простых людзей, то яны не разумеюць паняцце «лідэр нацыі». Ні ў адной канстытуцыі свету няма такой катэгорыі. Хіба што ў Лівіі Кадафі носіць тытул «лідэр рэвалюцыі». Увогуле, стаўленне ў масах да ініцыятывы адмоўнае. Хіба ў краіне іншых праблем няма? Застаецца дадаць, што Захад ніяк не каментуе законапраект.

***— Ці не паўплывалі на ініцыятыву дэпутатаў апошнія падзеі ў Кыргызстане?***

— Цікава, што Ермухамет Ертысбаеў, дарадца прэзідэнта, спецыяльна падкрэсліў: кіргізская рэвалюцыя ніяк не паўплывала на ініцыятыву дэпутатаў. Аднак большасць экспертаў бачаць у гэтым менавіта следства падзей у Бішкеку. Прэзідэнт намагаецца перастрахавацца на будучыню, каб не апынуцца ў такой сітуацыі, як Бакіеў, супраць якога ў Бішкеку распачата крымінальная справа. Пра кіргізскі след сведчыць і апошні выступ Назарбаева. 1 мая ён вельмі эмацыянальна казаў пра «бандытызм, які адбываецца ў Кыргызстане». У той жа дзень міліцыя разагнала мітынг апазіцыі ў Алма-Аце. Да гэтага часу зачыненая мяжа з Кыргызстанам.

***— Ці вырашыць інстытут «лідэра нацыі» праблему перадачы ўлады ў Казахстане?***

— З пункту гледжання захавання ўлады і перадачы яе нашчадкам Назарбаева пытанне застаецца адкрытым. Паперкай нельга заблакаваць кіргізскі варыянт, які цалкам магчымы як мінімум у эканамічна дэпрэсіўных рэгіёнах краіны. Хутчэй за ўсё, факт узнікнення падобнага закона гаворыць пра тое, што фінансавых рэсурсаў у Астаны засталося няшмат. З другога боку, такі закон накіраваны на стварэнне юрыдычнай асновы для падаўлення народных выступаў. Як бачым, рэжым робіць выснову з кіргізскіх падзей, аднак яны абсалютна супярэчаць здароваму сэнсу. Папросту дамінуюць страх і інстынкт самазахавання. Аднак нельга выключаць, што «лідэр нацыі» спатрэбіўся для канстытуцыйнай рэформы. Атрымаўшы падобны статус, Назарбаеў можа зрабіць наступны крок — пачаць пераход да канстытуцыйнай манархіі. Думаю, трэба пачакаць да 25 чэрвеня. У гэты дзень спецыяльны камітэт зробіць заключэнне па ініцыятыве.

***— Звычайна, грамадскасць у аўтарытарных краінах, не маючы магчымасці ўплываць на падобныя ініцыятывы, кампенсуе ўсе жартамі і смехам.***

— Хапае і жартаў. Напрыклад, на адным з форумаў я бачыў прапанову назваць Назарбаева ў дадатак «лідэрам планеты Зямля» і «Бічом Божым». Смяюцца з таго, што хутка Назарбаева давядзецца называць «спадар лідэр нацыі». Аднак я б не сказаў, што настрой занадта вясёлы. Хутчэй, сорамна за краіну.

ГЕАПАЛІТЫКА

# СВЯТА НЕ БУДЗЕ

Алег ПЯТРОЎ

**Прыхільнікі федэралізацыі Італіі адмаўляюцца святкаваць юбілей аб'яднання краіны.**



Саму гадавіну адсвяткуюць толькі праз год, 17 сакавіка 2011 года ў Турыне. Менавіта ў гэты дзень у 1860 годзе парламент абвясціў пра стварэнне на базе Савойскай дзяржавы Італьянскага каралеўства. Закончылася даўняя амаль 50-гадовая вайна за аб'яднанне краіны, фрагментамі якой былі войны Напалеона, дзве вайны з Аўстрыяй, серыя няўдалых паўстанняў карбанарыяў, дэсант Гарыбальдзі на Сіцылію.

Здавалася, такая падзея, як адзінства нацыі, не можа быць прадметам палітычных спрэчак. Тым больш у 1911 годзе Італія вельмі гучна адсвяткавала 50-ю гадавіну. Тады ў тым жа Турыне прайшла сусветная тэхнічная выстава, якая, на думку шматлікіх гісторыкаў, дала старт індустрыялізацыі краіны.

Аднак не ўсе прытрымліваюцца такой думкі. Напрыклад, сябры партыі «Ліга Поўначы», якая выступае за стварэнне на поўначы краіны асобнай дзяржавы або як мінімум надання гэтаму раёну шырокай аўтаноміі. На іх думку, на Поўначы і на Поўдні розныя ментальнасць, культура, традыцыя. Трэба прызнаць, што ідэя федэралізацыі падзяляецца шмат якімі жыхарамі больш заможных за паўднёвыя паўночных правінцый. «Ліга Поўначы» ўваходзіць у склад італьянскага ўраду, мае ў парламенце 37 дэпутатаў і 23 сенатары.

Скандал пачаўся 3 мая. Міністр юстыцыі Кальдэрон, сябра партыі «Ліга Поўначы», на пасяджэнні ўраду заявіў, што не збіраецца ўдзельнічаць у святкаваннях 150-й гадавіны аб'яднання Італіі. На просьбу аднаго з міністраў растлумачыць матывы такога незвычайнага ўчынку, Кальдэрон толькі сказаў: «Да пабачэння».

Пазіцыю аднапартыйца больш дэталёва растлумачыў старшыня партыі Умберта Босі. У інтэрв'ю выданню газеце «Republica» ён заявіў: «Святкаванне 150-й гадавіны адзінства Італіі мне здаецца справай не важнай і дастаткова рытарычнай. Я яшчэ не прыняў рашэння наконт таго, ці браць удзел у гэтым мерапрыемстве».

Падзеі ў Турыне 150-гадовай даўніны не заслугоўваюць увагі, паколькі, перакананы Босі, тады была зроблена фатальная памылка. У якасці мадэлі дзяржаўнага ладу былі прыняты унітарызм, а не федэралізм. Гэта заклала пад дзяржаву бомбу з гадзіннікавым механізмам. Унітарны эксперымент, лічыць лідэр партыі, абавязкова закончыцца катастрофай, падобнай на тую, якую зараз перажывае Грэцыя: «Федэралізм — лепшая прафілактыка ад банкруцтва. У выпадку федэралізацыі Італіі багатая Поўнач перастане даваць грошы беднаму Поўдню, а той, у сваю чаргу, перастане прадаць халяўныя сродкі і навучыцца элементарнай эканоміі».

Босі таксама заклікаў напісаць новую гісторыю Італіі. На ягоную думку, Кавур — прэм'ер ураду П'емонта, бацька аб'яднання, быў перакананым федэралістам і менавіта федэралістычныя ідэі рухалі тымі, хто ішоў ваяваць за адзіную Італію. Аднак у выніку патрыётаў-федэралістаў падманулі. Пасля перамогі над аўстрыйцамі п'емонцкі манарх Віктар Імануіл II быццам падманам навязаў дзяржаве унітарызм.

У прынцыпе, спробаў перапісаць гісторыю заўсёды хапала. Прычым таксама з пазіцый таго, што Савойскі дом сапраўды згуляў своеасаблівую партыю, ужыўшы нацыянальныя лозунгі ў якасці прынады.

Сацыялісты (у тым ліку Грамшы) пісалі пра тое, што Турын скарыстаўся сацыяльнымі пратэстамі насельніцтва Поўдня супраць мясцовых эліт. Ёсць гістарычныя школы, якія бачаць у аб'яднанні краіны акт каланізацыі Поўдня, за кошт якога Поўнач пасля здзейсніла індустрыяльную рэвалюцыю. Існуе і масонская версія, адпаведна якой вольныя муляры пад соусам аб'яднання Італіі расправіліся з папскім клерыкалізмам.

Так ці інакш, крытыкуючы розныя аспекты гісторыі аб'яднання, ніхто не аспрэчваў прагрэсіўнага характару стварэння адзінай італьянскай дзяржавы. Першым на такое рашылася партыя Босі, чым наклікала на сябе крытыку.

Самае цікавае, што ў авангардзе крытыкі Босі ідзе Ватыкан, які ў 1860-я гады паслядоўна выступаў супраць ідэі італьянскай дзяржавы. Пасля таго, як італьянскія войскі занялі Рым у 1870 годзе і перанеслі сюды сталіцу, Папа Пій IX увогуле абвясціў сябе ватыканскім вязнем.

Цяпер касцёл падкарэктаваў падыходы. Па словах святароў, менавіта каталіцкая вера ў часы феадальнай анархіі і юрыдычнай раздробленасці была вялікім фактарам падтрымання нацыянальнай свядомасці.

«Сепаратызм не пройдзе!» — пад такім заклікам падпісаліся буйныя італьянскія прамыслоўцы пад кіраўніцтвам уладальнікаў вядомага аўтамабільнага канцэрну «Fiat». Незадаволеныя нават сябры партыі Берлусконі. Яны заклікаюць прэм'ера націснуць на Босі, пакуль тэма нацыянальнага адзінства не стала манаполіяй левай апазіцыі.

Атака на Босі, які піша прэса, хутчэй за ўсё, прымусіць яго быць у Турыне ў сакавіку наступнага года.



Паўстанне ў Мілане. Ламбардыя. Ксілаграфія. 1848

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МАРТА КАЧЫНЬСКАЯ



Дачка польскага прэзідэнта Леха Качынскага заявіла ў прэсе пра намер уступіць у партыю «Права і справядлівасць» (PiS). Такі крок — абсалютна нечаканы для ўсіх. Дзяўчына ніколі не падзяляла кансерватыўных поглядаў бацькоў. У маладосці нават была анархісткай і панкам. Яе музычныя густы выклікалі скандалы з бацькамі. Яе другім мужам стаў чалавек, звязаны з партыяй Саюз левых дэмакратаў (галоўны ідэйны праціўнік PiS). Шлюб з левым палітыкам выклікаў вялікі канфлікт у сям'і Качыньскіх. Яе дзядзька Яраслаў Качыньскі нават адмовіўся прыходзіць на вяселле. Праўда, цяпер усе былыя разборкі забытыя: Марта ўвайшла ў камітэт Яраслава Качыньскага. Дарэчы, у адрозненні ад дачок прэзідэнтаў Валенсы і Квасьнеўскага, якія ўвесь час тусаваліся па сталічных клубах на радасць папарацы, дачка Качыньскіх надае перавагу сям'і (у яе дзве дачкі). Аднак цяпер пра прыватнасць можна забыць. Падаўшы заяву на сяброўства ў PiS, Марта стала публічнай асобай. Акрамя ўступлення ў партыю бацькі, яна збіраецца заснаваць Фонд дапамогі родным ахвяраў смаленскай катастрофы. Галоўным чынам фонд будзе аказваць псіхалагічную дапамогу.

### ДЭВІД МІЛІБЭНД



Актывіст лейбарысцкай партыі Вялікабрытаніі зрабіў вялікі крок па кар'ернай лесвіцы. Пасля таго, як 10 мая Гордан Браўн заявіў пра сваю адстаўку з пасады старшыні партыі, уся прэса дружна сцвярджае, што менавіта Дэвід цяпер павядзе за сабой брытанскі рабочы рух. Праўда, азімут гэтага паходу пакуль не вядомы. Мілібэнд нарадзіўся ў Лондане ў 1965 годзе ў сям'і з моцнымі левымі традыцыямі. Яго маці — польская яўрэйка. Дзед у 1919–1921 гадах змагаўся ў Чырвонай Арміі. Увогуле, Мілібэнд ганарыцца сваім паходжаннем. Атрымаўшы дыплом палітолага, ён прыйшоў у палітыку ў камандзе Тоні Блэра. Ужо ў 29 гадоў Дэвід адказваў за палітычны аддзел у складзе Кабінета міністраў. З 2001 года ён дэпутат парламенту. У 2005-м Дэвід стаў уладальнікам партфеля міністра экалогіі, у 2007-м — сакратаром па замежных справах. На гэтай пасадзе ён запомніўся як прыхільнік еўрапейскай інтэграцыі і ініцыятар высылкі ізраільскага дыпламата за махінацыі з брытанскім пашпартам. Дададзім, што Мілібэнд — першы міністр у гісторыі Вялікабрытаніі, які пачаў весці ўласны блог.

### РАУЛЬ БАДУЭЛЬ



Ваенны трыбунал, які працаваў у зачыненым фармаце, асудзіў гэтага венесуэльскага генерала на 6 гадоў турмы за злоўжыванне ўладай. Адначасова Бадуэля назвалі «ворагам рэвалюцыі» і забаранілі яму выстаўляць сваю кандыдатуру на выбарах. Родныя Бадуэля са спасылкай на ягоныя словы кажуць, што працэс быў цыркам: суддзі папросту выконвалі загад прэзідэнта Уга Чавеса. Так ці інакш, гісторыя Рауля яскрава характарызуе венесуэльскага лідэра. Ён пакараў свайго сябра, якому, магчыма, абавязаны жыццём. Яшчэ ў 1992 годзе маладыя афіцэры Рауль і Уга разам спрабавалі няўдала звергнуць непапулярнага прэзідэнта Перэса, за што трапілі ў турму. У красавіку 2002 года, падчас спробы перавароту супраць Чавеса, Бадуэль вызваліў таго з палону. Аднак пра сяброўства і ўсе заслугі Бадуэля Чавес забыў, калі ў 2007-м той публічна раскрытыкаваў праект канстытуцыйнай рэформы, адпаведна якой Уга Чавес мог абірацца на пасаду прэзідэнта неабмежаваную колькасць разоў. Як следства, Бадуэля хуценька пазбавілі пасады міністра абароны, ён трапіў у апалу, а год таму яго арыштавалі, каб зараз надоўга схаваць за краты. Застаецца дадаць, што Бадуэль — не першы блізкі да Чавеса чалавек, які ў выніку аказаўся на нарах. Раней былі асуджаны на доўгія тэрміны міністр фінансаў Чавеса і адзін з афіцэраў службы ягонай аховы.

З НАГОДЫ

# ПАДЗЕІ Ў РЫТМАХ І РЫФМАХ

Аляксандра ЛАЗОЎСКАЯ

**20 мая ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі адбудзецца вечар сучаснай беларускай песні і паэзіі «Рытмы і рыфмы», на якім барды Таццяна Беланогая, Юры Несцярэнка і Віктар Шалкевіч зробяць усё магчымае, каб задзейнічаць публіку ў незвычайным творчым эксперыменце.**

Прадстаўнікі трох розных пакаленняў беларускай музыкі, балансуючы на сумежжы некалькіх стыляў — року, блюзу і аўтарскай песні, — распавядуць кожны сваю асабістую гісторыю. Акрамя таго, гледачоў чакаюць дасціпныя жарты вядучага Мюра Фарыдовіча, развагі пісьменніцы Людмілы Рублеўскай, паэтычныя штукарствы Вікі Трэнас — упершыню разам на тэатральнай сцэне.

Кожны з удзельнікаў канцэрта мае добрыя навіны і гатовы падзяліцца пазітыўным настроем як з чытачамі, так і з наведнікамі імпрэзы.

### ЛЮДМІЛА РУБЛЕЎСКАЯ: «ЗАКЛІКАЮ ПРАЯЎЛЯЦЬ УВАГУ АДНО ДА АДНАГО»



***— Якія прыемныя для вас падзеі нядаўна адбыліся?***

— Зараз я завяршаю працу над сваім новым раманам «Сутарэнні Ромула», які ахоплівае ўсю гісторыю Беларусі, ад часоў Вялікага княства Літоўскага і да сучаснасці. Нядаўна наша дачка Вераніка Шніп, бас-гітарыстка ў гурце «Scales», прымала ўдзел у фестывалі альтэрнатыўнага року «Другое дыханне». Гурт прайшоў у фінал і атрымаў спецыяльны прыз журы для запісу дэма-версіі. Акрамя таго, мы з Веранікай прадстаўляем сумесны праект — візуальна-паэтычную выставу «Забытыя словы. Забытыя рэчы» ў бібліятэцы імя Цёткі (мае вершы і Веранікіны фотакалажы).

***— Якія ўражанні ад сумесных выступаў з музыкантамі «Рытмаў і рыфмаў»?***

— Мы з Віктарам Шніпам абое супрацоўнічаем з музыкамі і мастакамі. Наша знаёмства з Юрыем Несцярэнкам пачалося з таго, што ён напісаў песню на мой верш, які проста знайшоў у кнізе. Ён якраз з тых людзей, якія спалучаюць у сабе зацікаўленасць у розных відах мастацтва: музыка, паэзія, да таго ж, Юры піша цікавую прозу. Мне падабаецца, як ён працуе: гэта сапраўды высокі прафесіяналізм, я ведаю, што ён выдатны блюзавы музыкант. Калі я чую яго ныя песні, мне хочацца пісаць вершы, а гэта адзін з паказчыкаў таго, што твор удаўся.

Дарэчы, на канцэрце хочацца пабачыць прадстаўнікоў розных пакаленняў, розных інтарэсаў і прафесій. Было б вельмі карысна, каб прыйшлі не толькі філолагі, гісторыкі, паэты, то бок людзі, зацікаўленыя прафесійна. Праблема нашай творчай інтэлігенцыі ў тым, што яна раз'яднаная. Мастакі не чытаюць пісьменнікаў, пісьменнікі не наведваюць выставы, артысты не ведаюць ні кампазітараў, ні пісьменнікаў, ні мастакоў. Усе знаходзяцца ў сваіх лакальных тусоўках, дзе ёсць свае лідэры. Я стараюся быць у курсе таго, што адбываецца ва ўсіх сферах культурнага жыцця, маю шырокае кола зацікаўленасцяў. З апошняга, што я бачыла,— прэм'ера ў Купалаўскім тэатры спектакля Пінігіна «Translations». Пра яго ёсць самыя розныя меркаванні. Мне ж гэты спектакль вельмі спадабаўся. Такім чынам, я заклікаю творчую інтэлігенцыю праяўляць увагу адно да аднаго.

### ВАСІЛЬ ДРАНЬКО-МАЙСЮК (МЮР ФАРЫДОВІЧ): «ХАЧУ ЎБАЧЫЦЬ ДЫЯЛОГ ПАМІЖ ПАЭЗІЯЙ І СПЕВАМІ»



***— Тэатралізавана-барабанная чытка вашай п'есы «Цуда-малпа» нядаўна прайшла на малой сцэне Тэатра беларускай драматургіі і ў фотамайстэрні на Ракаўскай.***

— Так, у фотастудыі Аляксандра Жарнасека на вуліцы Ракаўскай ёсць магчымасць ладзіць незвычайныя музычныя чыткі, у якіх адбываецца дыялог паміж музыкай (музыкамі) і голасам (акцёрамі). Першай нашай чыткай на фотастудыі стала прадстаўленне асобных раздзелаў п'есы Францішка Аляхновіча «Дрыгва». Мая п'еса-казка «Цуда-малпа» — зусім іншы, вясёлы твор. Гэта іранічнае назіранне за сучасным інфантыльным грамадствам, якому час станавіцца дарослым і адказваць за свае ўчынкі. Я рыхтую яшчэ дзве жартоўныя антырэлігійныя п'есы з часопіса «Маладняк» 1924–1925 гадоў.

***— Чаго вы чакаеце ад канцэрта?***

— Я на гэтым канцэрце выступаю як вядучы, сэнсава спалучаю тры цікавыя і важныя блокі, дзе выступаюць зоркі нашага «бардаўства». Мая задача — зрабіць цікавыя і вясёлыя «падуанскія» мосцікі. Я хацеў бы бачыць не толькі сольныя выступленні, але і дыялог паміж паэзіяй і спевамі.

Разам з Максімам Іўкіным у складзе групы «Жаба ў каляіне» мы двойчы выступалі на вечарынах, дзе ўдзельнічаў таксама і Віктар Шалкевіч. Ён умее і спяваць, і артыстычна падаваць свае тэксты, у адрозненне ад многіх бардаў. Цікава і слухаць, і глядзець. Ён можа падабацца ці не падабацца, але гэта сапраўдны артыст сярод бардаў, які выклікае павагу.

### ТАЦЦЯНА БЕЛАНОГАЯ: «НОВЫ АЛЬБОМ ФАКТЫЧНА ГАТОВЫ»



***— Вы вельмі актыўна апошнія месяцы працавалі ў студыі. Над чым?***

— Паколькі песень было вельмі шмат, я вырашыла запісаць новы альбом. Музыканты часам не маюць «штуршка» для таго, каб пачаць студыйны запіс, бо выдаць альбом — па-сутнасці акрэсліць пэўны адрэзак свайго жыццёвага перыяду. Чаму я не выдала дыск раней, чаму толькі зараз? Пэўна, адчула, што патрэбны час прыспеў. Нарэшце альбом фактычна гатовы, хоць, вобразна кажучы, яго яшчэ трэба «апрануць» (смяецца). Думаю, што кружэлка будзе называцца «Ніткі»: нябачныя повязі, знітаванні — сімвал, які злучае нас эмацыйна з дарагімі і блізкімі нам незалежна ад таго, дзе мы знаходзімся. Дыск не сацыяльны, ён пра мой сум па людзях. Гэта спакойны акустычны альбом, не абцяжараны іншымі інструментамі, аранжыроўкамі. Некаторыя песні даволі багатыя, таму нельга іх выканаць без сур'ёзнага падыходу. Складана даверыць іх іншым музыкам.

***— Ці будуць новыя кампазіцыі на канцэрце?***

— Збольшага якраз я планую выконваць новы альбом, праграму, якая складалася ў мяне каля двух гадоў, некаторыя песні ўжо знаёмыя слухачам, некаторыя прагучаць упершыню.

### ЮРЫ НЕСЦЯРЭНКА: «Я ХУТЧЭЙ АЎТАР І ВЫКАНАЎЦА, ЧЫМ БАРД»



***— Нядаўна выйшаў новы альбом гурта «White Night Blues», пра што ён?***

— Канцэртны альбом «Live in Poland» быў запісаны з дапамогай нашых польскіх калег у ліпені 2009 года ў Бяла-Падлясцы ў межах нашага выступлення на міжнародным блюзавым фестывалі Biala Blues Festival. 15 мая ў паб-клубе «Графіці» наша каманда ў поўным складзе будзе прэзентаваць кружэлку. На дыску прадстаўлены стандартны блюзавы рэпертуар, класіка і аўтарскія творы.

***— Існуе стэрэатып, што бардаўская песня не зусім прафесійная з пункту гледжання музычнага афармлення і выканання.***

— Думаю, што такі стэрэатып можа існаваць абсалютна ў любым відзе мастацтва. У кожнай галіне культуры і творчай дзейнасці ёсць майстры і рамеснікі. Я хутчэй аўтар і выканаўца, чым бард. У бардаўскай традыцыі я не зусім вольна сябе адчуваю, нягледзячы на тое, што неаднаразова браў удзел і нават перамагаў у конкурсах, фестывалях бардаўскай песні. Традыцыя, якая склалася на падставе творчасці шасцідзесятнікаў, цяпер не зусім дакладна перадаецца. Тыя людзі, якія яе сфарміравалі, нашмат больш сур'ёзна ставіліся да якасці. Сапраўдныя віртуозы ў стварэнні такога рэпертуару не прэтэндуюць на масавую папулярнасць. Плынь шасцідзесятнікаў, акрамя таго, вельмі цікавая па паэтычнай частцы, хоць і музычную яны таксама стараліся падтрымліваць. Адказ на гэта пытанне, на мой погляд, можа стацца цэлым даследаваннем.

### ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ: «ДЛЯ АКЦЁРА НЕ ВАЖНА, ДЗЕ ЁН ВЫСТУПАЕ»

***— Вітаем вас з выхадам новага альбома!***



Photo.ByMedia.Net

— Перадусім на альбом працуюць усе: пачынаючы ад тых, хто стаіць на сцэне, заканчваючы тымі, хто сядзіць у залі. Калі чалавек, які быў на канцэрце, пазнае сябе на запісах па сваіх апладысментах і воклічах, гэта здорава. Жывы гук мне заўсёды падабаўся. Гэта «замарожаны» час, які заўсёды можна «размарозіць» і паслухаць. Альбом ёсць такі, які ён ёсць. Не горшы і не лепшы. Гэта люстэрка, якое паказвае цябе, у якое ты можаш праз пэўны час паглядзець і пазнаць або не пазнаць сябе.

***— Якая сярод усіх вашых кружэлак найбольш блізкая вам?***

— Бывае, у сям'і да кагосьці мама ставіцца больш прыхільна, да кагосьці — тата, можа, бывае такое, мужчына цэніць сыноў, жанчына любіць дачок, але пры ўсім пры тым бацькі аднолькава моцна любяць сваіх дзяцей. Мае альбомы — гэта мае дзеці. Над кожнай песняй мучыўся, нешта выдумваў, кожная песня мае сваю гісторыю. Пра іх можна расказваць бясконца. Яны мне ўсе дарагія. Я ніколі ў жыцці іх не адрозніваў.

***— Вы выступалі раней разам з Таццянай Беланогай і Юрыем Несцярэнкам?***

— Я заўсёды казаў і кажу: не бывае так, каб яблык на галіне адразу з'яўляўся вялікім, чырвоным і салодкім, мы ведаем, што спачатку павінны быць кветкі, якія мусяць апыляцца пчоламі, пасля з'яўляецца завязь, якая расце, і тады толькі будзе яблык. Мне прыемна, што традыцыя аўтарскай песні не знікае і мае свой працяг, што і Таня, і Юра адчуваюць свет і могуць гэта перадаць у радках, з гітарай.

***— Як акцёр ці маеце вы пэўныя сантыменты да тэатральнай сцэны? У чым яе спецыфіка?***

— Ды няма ніякай спецыфікі сцэны! Ведаеце, калі памяшканне назваць тэатрам ці кінатэатрам, ад гэтага нічога не зменіцца. Для акцёра не важна, дзе ён выступае. Галоўнае — людзі, якія сядзяць перад ім і слухаюць яго.

На гэтым канцэрце я выканаю любімыя песні, што на вялікіх канцэртах не спяваю. Зала будзе камерная. Пастараюся прадставіць некалькі новых песень, якія яшчэ ніхто не чуў.

ФЕСТЫВАЛІ

# СЯРОГУ ТУТ НЕ ЧАКАЛІ...

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Яшчэ ў 2004 годзе, калі беларускамоўны рэп толькі пачынаў рабіць першыя крокі на нашых канцэртных пляцоўках, у прадмове да першай айчыннай рэп-складанкі «Пасадзіў DEAD RAPку/ Rap Not Dead» аўтар гэтых радкоў выказаў спадзяванне, што дыск «стане прадвеснікам узнікнення ўплывовага руху, які аб'ядкае і прыхільнікаў аўтэнтычнага рэпу, і наватараў стылю, і тых свядомых рэпераў, для якіх гукі роднай мовы нешта значаць».**






З тых часоў адбыліся фестывалі сапраўднага беларускага рэпу, з'явіліся першыя беларускамоўныя зоркі вулічнага стылю чытання, а музычныя крытыкі з упэўненасцю загаварылі пра феномен «беларускага рэпу», абмяркоўваючы яго плюсы і мінусы.

І хоць многія аўтарытэтныя чытальнікі беларускамоўнага рэпу па розных прычынах цяпер адышлі ад актыўнай канцэртнай дзейнасці (Павел Зыгмантовіч — «Пан Жыжма» працуе ў Маскве, Сяржук Давідзенка — «Шляхта» — засярodзіўся на сям'і, Кроў (ЧпБ) звязаў свае творчыя планы з тэлебачаннем...), на айчыннай сцэне не перастаюць з'яўляцца вартыя выканаўцы, якія рэгулярна праводзяць канцэрты, выдаюць альбомы, здымаюць кліпы. А гэта значыць, традыцыя працягвае жыць, узбагачаць сучасную нацыянальную культуру.

З часу прэзентацыі дыска «Пасадзіў DEAD RAPку/ Rap Not Dead» мінула ўжо некалькі гадоў, і надышоў час зрабіць агляд творчых сіл, якія ставяць на мэце сінтэз роднага слова і электронных бітаў рэпу. Гэту ідэю ўзяўся рэалізаваць малады і амбіцыйны выканаўца Vinsent, які запрасіў у клуб «Рэактар» многіх выканаўцаў, што арыентуюцца ў сваёй творчасці на мову Купалы і Коласа. Гэтыя памкненні былі падтрыманыя і слухачамі, якія ў той дзень запоўнілі залу клуба ў чаканні вядомых хітоў і прэм'ер.

Першым на фестывальную сцэну былі запрошаны рэп-дуэт «PANaNieba» з Вілейкі. У суправаджэнні DJ Maltak'а яго ўдзельнікі Sviedak і SP Kava прадставілі свой гурт у традыцыйным олдскульным intro, а таксама зачыталі некалькі трэкаў з будучага альбома «PANaNieba» «На Балоце». Адчуваецца, што выканаўцам партэбны канцэртны досвед, каб больш дасканала агучваць тэкст, ствараць адпаведнае стылю шоу.

Тым не менш, невялікі сцэнічны вопыт рэперы кампенсуюць шчырасцю пачуццяў і яскравасцю актуальных тэкстаў. Да таго ж на сцэне ім дапамагалі такія ветэраны айчыннай рэп-сцэны, як Zeman і Condor. Дарэчы, Zeman выходзіў на сцэну і са сваімі спробамі ў freestyle, якія тэматычна былі прысвечаны Беларусі і яе сённяшняму дню. Слухачы з вялікай прыхільнасцю сустрэлі гэтыя эксперыменты, бо беларускамоўны freestyle пакуль застаецца самым складаным раздзелам айчыннай рэп-культуры.

Рэп-групаўка з Лунінца «Lunclan» — прыхільнікі традыцыі і стылю. Мо таму ў іх кампазіцыях шмат таго, што так падабаецца слухачам: гумарыстычныя, а часам і злосныя тэксты, вялікая доля імправізацыі, спецыфічная для хіп-хопу лексіка. Але ў «Lunclan» усе гэтыя атрыбуты стылю маюць выразны беларускі каларыт. Мо таму слухачы так цёпла сустрэлі кампазіцыі лунінецкіх выканаўцаў «Менск», «У Машы», «My school», якія тыя чыталі разам са слухачамі.

Рысы небанальнасці гэтаму рэп-фэсту надалі арыгінальныя конкурсы ад грамадска-культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!». Акрамя традыцыйных спаборніцтваў на веданне творчасці ўдзельнікаў фэсту, арганізатары прапанавалі тым, хто ў гэты дзень прыйшоў у «Рэактар», паспрабаваць сябе ў якасці рэп-выканаўцаў. Для гэтых конкурсаў былі выбраныя знаныя вершы Уладзіміра Караткевіча «Мова» і «Заяц варыць піва», якія трэба было прачытаць з выкарыстаннем рэп-канонаў. Пераможцам паводле інтэнсіўнасці апладысментаў быў вызнанаы малады паэт Васіль Мялешка, які лепш за ўсіх выкарыстаў рытміку радкоў Караткевіча для іх дэкламацыі са сцэны.





«Жывое» выступленне Vinsent'а ўпершыню мне ўдалося пачуць на 10-годдзі гурта «B: N:», калі тыя запрасілі рэпера выступіць разам на адной сцэне. Думаю, многіх тады ўразіла яго экспрэсіўная манера чытання, блізкая да рок-вакала. Нешта ў гэткай манеры чакаў ад выступлення Vinsent'а ў клубе «Рэактар»...

Але гэтым разам выканаўца паўстаў у зусім іншай іпастасі: лірыкам, які пранікнёна чытаў рэп «Лютаўскі дождж» і знакаміты «Восеньскі вальс» з дэбютнага альбома «Пачатак», філосафам — у чытанках «Сапраўдныя людзі», «Наша слова ў небяспецы», «Я працягваю жыць», «Ты на небе». А яшчэ — чалавекам, якога хвалюе будучае роднага краю, які ён бачыць свабодным і незалежным. Такія творы, як «Бог, Радзіма, Воля», «Слава героям» знаходзілі гарачы водгук у моладзевым асяроддзі, бо маюць універсальныя якасці, характэрныя для твораў сапраўднага мастацтва. Хоць бы сабе і вулічнага...

Слухачам відавочна падабаецца, што Vinsent, нягледзячы на сваю маладосць, пазіцыянуе сябе стваральнікам і захавальнікам традыцый беларускамоўнага рэпа, бярэ на сябе лідэрскія функцыі. Аўтарытэту і вядомасці выканаўцу надаюць і першы альбом «Пачатак», і шыкоўны відэакліп «Восеньскі вальс», які атрымаў прэстыжныя прэміі «Street Awards» і «Кліп-марафон». А таксама тое, што рэпер пастаянна ўдасканальвае тэхніку чытання, надае вялікую ўвагу вобразнасці і лексічнай узорнасці беларускамоўных тэкстаў, стварае шоу, якое гарманізіруе з вобразамі і сімваламі, што ўзнікаюць у час выканання той ці іншай кампазіцыі.

Яшчэ адзін ветэран айчыннай рэп-сцэны — Вожык (ТО Лапата), цяпер жыве ў Сянно і па праву можа называцца рэгіянальным выканаўцам. Нягледзячы на свой правінцыйны статус, Вожык запісаў некалькі кампазіцый, якія прынеслі яму папулярнасць. Вось і на фэсце ім быў выкананы новы трэк «Амерыка скрозь» з будучага альбому «У віры падзей», якія былі створаны ў супрацоўніцтве з вядомым прадстаўніком амерыканскай хіп-хоп-культуры Popa Chief, які прадстаўляе гурт «Zu-Ninjaz» — частку легендарнай фармацыі Wu-Tang Killa Beez.

Таксама была цёпла прынята слухачамі і апошняя чытанка Вожыка «Вечна жывая», якую ён прысвяціў Беларусі. Дарэчы, падчас фэсту стала відавочна, што тэматыка Беларусі — краіны, якая да гэтага часу змагаецца з учэпістай імперыяй за незалежнасць, — вельмі хвалюе айчынных рэпераў. І гэтая асаблівасць надае вырашальнае адрозненне нашым выканаўцам ад тутэйшых апалагетаў «русского репа».

Што да згаданага ў загалоўку вядомага гамяльчаніна Сярогі, то гэты рэп-бізнесовец з маскоўскай прапіскай па вызначэнні не мог стаць удзельнікам такіх рэп-сустрэч. Хоць талент Сержука як аўтара і чытальніка здольны быў вылучыць яго ў лік самых выбітных беларускіх рэп-гуру.

Бяда Сярогі ў тым, што ён ужо даўно забыўся, што «беларус» — гэта не толькі адзнака ў пашпарце, што гэта — сінонім паняцця «грамадзянін сваёй краіны», які паважае карані і мову свайго народа. Бо без ведання гісторыі і мовы свайго народа такі «грамадзянін» становіцца ўвасабленнем карыкатурнага «недабеларуса». Гэта разумеюць Vinsent і яго сябры, якія знайшлі свой шлях у рэчышчы нацыянальнай культуры. Ці стане гэта відавочным для іншых прадстаўнікоў хіп-хоп-культуры, якія спрабуюць знайсці сябе на супрацьлеглым баку беларускай рэп-сцэны?

АБ'ЯВА

**ДУДАРСКІ ФЭСТ**

**19 мая. Танцавальная крытая пляцоўка парка Чалюскінцаў**

**18.00–22.00**

**Гурты:** «Стары Ольса», «Znich», «Litvintroll», «Testamentum terrae», «Кейлі Кёл», «Расалія», «Unia» і шмат іншых.

**Кошт квіткоў:** 20 000 папярэдне, 25 000 у дзень канцэрту.

Хто набудзе квіток папярэдне, атрымае плакат гурта «Стары Ольса» ў падарунак!

**Кропкі продажу:** пераходы Я. Коласа, Кастрычніцкая, ГУМ, ГЦ Купалаўскі (19-я кропка), ГЦ Рыга (18-я кропка) і інш.

Даведкі і замова квіткоў па тэлефоне: **649 08 88.**



ЗНАХОДКІ

# АРХІВЫ РАСКРЫВАЮЦЬ СВАЕ ТАЙНЫ


Аўтапартрэт Я. Ціхановіча, 1934


Партрэт невядомага, аўтар У. Галубок, 1936


Акварэльны аўтапартрэт Я. Ціхановіча, 1928


Партрэт брата Валянціна, 1932


Партрэт невядомай, 1932

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Не так часта ў Беларусі знаходзяць невядомыя мастацкія творы. І тым больш важкімі здаюцца такія знаходкі. Вось і кіраўнік культурна-асветнага клуба «Спадчына» Анатоль Белы прадэманстраваў грамадскасці свае мастацкія адкрыцці: некалькі графічных і акварэльных твораў беларускіх мастакоў, якія адносяцца да 30–40-х гадоў мінулага стагоддзя. Крыніцай гэтых знаходак стаў архіў аднаго са старэйшых беларускіх мастакоў Яўгена Ціхановіча.**

«Нагадаю, мастак Яўген Мікалаевіч Ціхановіч быў ганаровым сябрам культурна-асветнага клуба «Спадчына», — распавёў Анатоль Белы. — У свой час у рамках клубных мерапрыемстваў мы арганізавалі юбілейную мастацкую выставу, якую назвалі «Дынастыя». Для яе была прапанавана канцэпцыя, каб гэта была не толькі выстава аднаго Яўгена Мікалаевіча, а выніковая экспазіцыя, што распавядала пра творчасць усёй мастацкай дынастыі Ціхановічаў. Апошнія дні жыцця Яўгена Мікалаевіча сябры клуба апекаваліся ім: пастаянна наведвалі яго, гутарылі, дапамагалі ў розных надзённых справах. Адным словам, у нас склаліся вельмі цёплыя адносіны. І калі Яўгена Мікалаевіча не стала, яго майстэрня перайшла да іншых людзей. У сувязі з гэтым дачка мастака папрасіла нас забрацць адтуль усё, што належала яе бацьку, і перавезці ў музей. Гэта творы мастацтва, рамкі, паперы...»

Сярод усяго, што трапіла ў старадарожскі мастацкі музей, былі дзве вялікія папкі папер. У іх знаходзіліся графічныя працы дынастыі мастакоў, якімі яны аздаблялі старонкі часопісаў «Вожык», «Бярозка», газеты «Піянер Беларусі». Асабліва шмат было ў іх твораў Валянціна Ціхановіча. Спецыяльна для іх вылучылі асобную экспазіцыю, якая займае цэлую сцяну.

«Каб паскорыць працу, я разбіў архіў на некалькі частак па тэматыцы. Там была тагачасная палітычная карыкатура, у тым ліку і крытыка савецкага ладу жыцця, тагачасных калгасных рэалій. Таксама былі ў мастака прыродазнаўчыя, паляўнічыя і рыбалавецкія накіды. І вось неспадзяванка: у стосе гэтых замалёвак я знаходжу творы трыццатых гадоў: партрэты жонкі, брата Валянціна, аўтапартрэты. А сярод гэтых графічных і акварэльных прац бачу твор Галубка! Я патэлефанаваў сябру клуба, мастаку А. Крывенку: «Прыедзь, паглядзі, ці сапраўды гэта вартыя творы?» Калі ён прыехаў і пабачыў аркушы, сумненні зніклі: «Гэта выдатныя знаходкі!» — сказаў Анатоль Яўхімавіч.

Вядома, што да сёння захавалася толькі чатыры алейныя творы У. Галубка. Адзін з іх знаходзіцца ў мастацкім музеі ў Старых Дарогах, адзін — у сямействе Ціхановічаў, два творы экспануюцца ў Гомельскім тэатры чыгуначнікаў. Знаходкі паставілі пытанне пра тое, дзе яны будуць выстаўляцца, дзе з імі можна будзе пазнаёміцца аматарам і знаўцам беларускага мастацтва.

«Я меў размову з кіраўніцтвам Нацыянальнага мастацкага музея, — працягвае Анатоль Белы, — і прапанаваў перадаць туды адну ці некалькі знойдзеных мной прац з калекцыі Ціхановічаў. Але ўзамен папрасіў, каб спецыялісты Нацыянальнага музея прыехалі ў Старыя Дарогі і далі мастацкую адзнаку экспазіцыям майго музея. Для мяне важна, каб першы ў краіне прыватны мастацкі музей быў прызнаны і афіцыйна занесены ў рэестр культурных каштоўнасцяў. Трэба думаць пра будучыню майго прыватнага збору, бо калекцыі пашыраюцца, колькасць наведвальнікаў павялічваецца. Іх стане яшчэ больш, калі я выстаўлю новыя знаходкі з архіву Яўгена Ціхановіча».




Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 436
Падпісана да друку 14.05.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.